

ПАД АБАРОНАЙ ДУХУ АЙКІДО

ЧЫРВОНКА

ГАЛОЎНЫЯ ЛЕКІ АД «АЙБАЛІТАЎ»

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 ЖНІЎНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 148 (29015)

*ЛІЧБА ДНЯ*

**$8 млрд 627,9 млн (у эквіваленце)**

*склалі, па папярэдніх звестках, міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі на 1 жніўня, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка. За ліпень 2019 года золатавалютныя рэзервы выраслі на $337,1 млн (4,1 %) пасля росту ў чэрвені на $200,8 млн (2,5 %). У ліпені ўрадам і Нацыянальным банкам выканана знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на суму каля $500 млн.*



# ГАСПАДЫНЯ ПТУШЫНАЙ ЧАРАДЫ



**У калекцыі майстра па вырабе гліняных дзіцячых свістулек Ірыны ВАРОНЫ сабралася вялікая, можна сказаць, унікальная «птушыная чарада»: пеўні, сарокі, зязюлі, ластаўкі, вераб'і, салаў'і, жаваранкі, кнігаўкі, перапёлкі, дзятлы, буслы, лебедзі, гусі, качкі, совы і глушцы і, канешне, вароны... Ірына працуе ў Лёзненскім раённым Доме рамёстваў метадыстам. Яна захоўвае мясцовыя керамічныя традыцыі вёскі Бабінавічы, у якой жыве, у прыватнасці адраджае цацкі-свістулькі. Мара Ірыны Вароны — перадаць свае майстэрства бабінавіцкім хлопчыкам і дзяўчынкам.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

КОРАТКА

- **Аграрыі намалацілі больш за 5 мільёнаў тон збожжа.**
- 59 жанчын-механізатараў працуюць сёлета ў складзе экіпажаў камбайнераў, летась іх было 47.



- **Міжнародны пчалярскі кангрэс пройдзе ў Беларусі ў 2020 годзе.**
- Беларусь падпісала Сінгапурскую канвенцыю аб медыяцыі.
- **У Казахстане стартавалі Вайсковыя міжнародныя гульні — 2019.**
- Пакет з патронамі і запаламі ад гранат вылавілі ў Мінску з Цнянскага вадасховішча.
- **Мінінфарм заблакаваў 57 сайтаў за гандаль наркотыкамі.**

ISSN 1990 - 763X

Наш кашалёк

## КРЭДЫТЫ ПАТАННЕЮЦЬ?

**З 14 жніўня Нацбанк зніжае стаўку рэфінансавання — з 10 % да 9,5 % гадавых, стаўка па крэдыце овернайт зменшыцца з 11,5 % да 10,75 % гадавых, стаўка па дэпазіце овернайт — з 8,5 % да 8,25 % гадавых.**

Адпаведныя рашэнні прынятыя праўленнем Нацыянальнага банка па выніках учарашняга пасяджэння па грашова-крэдытнай палітыцы, паведаміў на брыфінгу **старшыня праўлення Нацыянальнага банка Павел КАЛАУР.**

Зніжэнне стаўкі рэфінансавання стала магчымае дзякуючы запаволенню інфляцыйных працэсаў у II квартале гэтага года. Плануецца, што да канца года інфляцыя стабілізуецца ў рамках мэтавага арыенціра ў 5 %. Сыходзячы, па словах Паўла Калаура, праінфляцыйныя фактары першага паўгоддзя — кан'юнктурны шок на рынку харчавання, рост заробкаў, рост цэн на паліва.

У цэлым, як заявіў старшыня праўлення Нацбанка, інфляцыйныя чаканні зніжаюцца, хоць яны застаюцца вышэйшыя за фактычную інфляцыю, што, у сваю чаргу, затрымлівае яе зніжэнне.

Рэгулятар адзначае, што «прынятыя рашэнні ў галіне працэнтнай палітыкі забяспечаць захаванне яе нейтральнага характару ва ўмовах прагназаванага запавольвання інфляцыйных працэсаў і дасягненне пастаўленай мэты па інфляцыі на 2019 год».

Далейшыя рашэнні ў галіне ключавых працэнтных ставак Нацыянальнага банка будуць залежаць ад суадносін паміж інфляцыйнымі і дэфляцыйнымі фактарамі.

Нагадаем, большасць банкаўскіх крэдытаў у нашай краіне прывязаная альбо да стаўкі рэфінансавання, альбо да стаўкі па крэдыце овернайт. Іх зніжэнне азначае, што крэдыты патаннеюць, бо паменшацца працэнтныя выплаты па даўгах.

Разам з тым прадстаўнікі Нацбанка прагназуюць запаволенне тэмпаў росту спажывецкага крэдытавання. У прыватнасці, як заявіў Павел Калаур, бурнае развіццё картак-растэрміновак, на яго думку, ужо сябе вычарпала.

**Святлана БУСЬКО.**

Кампетэнтна

## ЯКІМІ БУДУЦЬ АДКАЗЫ НА ЖЫЛЛЁВЫЯ ПЫТАННІ

### У будучым годзе для шматдзетных сем'яў плануюць пабудаваць амаль 14 тысяч кватэр

**Да канца 2019-га для такіх сем'яў узвядуць 12 тысяч кватэр. Сёння на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў стаяць 37 тысяч шматдзетных. Гэтыя лічбы назваў учора Дзмітрый МІКУЛЁНАК, міністр архітэктуры і будаўніцтва Беларусі.**

«Цяпер фарміруецца гэта праграма з улікам пошуку фінансавых сродкаў, у тым ліку на будаўніцтва. Аб'екты гэтыя вызначаны. У далейшым у 2021 годзе плануецца выйсці на выкананне даручэння Прэзідэнта па забеспячэнні на працягу аднаго года шматдзетным магчымасці будаўніцтва ў жылых дамах. І да гэтай мэты мы імкнёмся», — сказаў Дзмітрый Мікулёнак.

СТАР. 3



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Мінск і Лондан могуць знайсці новыя кірункі супрацоўніцтва

## Прэзідэнт высока ацаніў вынікі дзейнасці пасла Вялікабрытаніі ў Беларусі

**Завяршаецца тэрмін службы Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ў Беларусі Фіёны Гіб. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з дыпламатам у Палацы Незалежнасці, за тры з паловай гады зроблена тое, чаго не зрабілі дагэтуль усе паслы Каралеўства.**

«Я вам вельмі ўдзячны, бо гэта шмат у чым дзякуючы вам. Толькі дзякуючы вашай актыўнасці, настойлівасці, адкрытасці, шчырасці і справядлівасці можна было зрабіць тое, што было зроблена», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Апошнія гады Вялікабрытанія знаходзіцца на трэцім месцы па экспарце беларускіх тавараў. Летась наш таваразварот узрос да 3,4 мільярда долараў, экспарт беларускіх паслуг — да 265,2 мільёна долараў. Гэтыя дасягненні Аляксандр Лукашэнка назваў падмуркам любых адносін.

Ён не ўтойвае і складанасцяў, якія пасол сама добра ведае: беларуска-брытанскі экспарт і таваразварот шмат у чым залежаць ад паставак нафтапрадуктаў. Праз праблему з забруджанай нафтай, якая здарылася на нафтаправодзе «Дружба», таваразварот крыху «асеў», а гэта, на думку кіраўніка краіны, павялічыла патрэбу ў дыверсіфікацыі.

На сустрэчы зайшла гаворка і пра знешнепалітычнае становішча. Прэзідэнт лічыць Еўрасаюз апірышчам планеты разам з ЗША і Кітаем, Індыяй, Расіяй. На думку Аляксандра Лукашэнкі, калі хоць адну з гэтых апор вырваць, свет, зразумела, не абваліцца, але моцна захістаецца. А значыць, на парадак менш стане стабільнасці і ў нашым еўразійскім рэгіёне. Таму і брытанскім палітыкам, якія падчас дзейнасці Фіёны Гіб наведвалі Мінск, Прэзідэнт Беларусі казаў пра дваістыя пачуцці пасля заявы аб выхадзе іх краіны з ЕС.

«Вялікабрытанія — вельмі моцная краіна, яна шмат рабіла для Еўрасаюза, вызначала разам з Германіяй, Францыяй, Італіяй моц Еўрасаюза. Канешне, гэта велізарная страта. Але вялікія магчымасці для нас, таму што Вялікабрытанія валодае каласальным патэнцыялам», — мяркуе кіраўнік Беларусі.

Ён адзначыў, што будзе рады, калі Фіёна Гіб зойме на радзіме значную пасаду ў Міністэрстве замежных спраў. Да таго ж Аляксандр Лукашэнка папрасіў пасла давесці ў ведамстве думку аб патрэбе ў інтэнсіфікацыі нашых адносін. Прычым не адкладваючы, бо «ў бурлівы час пустот не бывае». Выказаў Прэзідэнт і пажаданне, каб Вялікабрытанія знайшла сябе ў Беларусі як частцы Еўразійскага эканамічнага саюза.

У Беларусі дзейнічаюць двухбаковыя праекты з Вялікабрытаніяй у сферах альтэрнатыўнай энергетыкі, дарожнага будаўніцтва, электрааўтамабілебудавання, сельскай гаспадаркі і харчавання, навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, банкаўскай справы і фінансаў.

«Зборка электробусаў і іншае — гэта дробязі ў параўнанні з тым, што мы можам рабіць у Вялікабрытаніі і што вы можаце зрабіць у Беларусі. З'явілася магчымасць актывізаваць нашы адносіны, вы можаце прымаць рашэнні больш свабодна. І няма чаго граху таіць: у вас цудоўныя стасункі са Злучанымі Штатамі Амерыкі. Я хацеў бы, каб гэтыя стасункі нейкім чынам былі праецыраваны і на Беларусь», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

«У нас шырокі спектр адносін, можна знайсці і новыя кірункі супрацоўніцтва, проста не трэба траціць часу. Думаю, што новы прэм'ер, новы ўрад актывізуюць гэтыя стасункі», — спадзяецца Прэзідэнт. Акрамя таго, ён выказаў удзячнасць брытанскаму боку за дапамогу ў рэабілітацыі дзяцей пасля чарнобыльскай аварыі, а таксама за супрацоўніцтва ў спорце і пажадаў Фіёне Гіб поспехаў у далейшай рабоце.

Пасол пацвердзіла журналістам, што адносіны паміж Беларуссю і Вялікабрытаніяй развіваюцца ў добрым, пазітыўным кірунку. Год таму было падпісанае пагадненне аб развіцці эканамічнага супрацоўніцтва. Фіёна Гіб падкрэсліла, што абодва міністэрствы замежных спраў шмат працавалі разам, каб прасоўваць гэтыя стасункі.

«Беларусь — вельмі важная краіна ў цэнтры Еўропы, трэба ацэньваць яе становішча. Як мы абмеркавалі, патэнцыял для двухбаковых адносін у будучыні вельмі добры», — паведаміла дыпламат.

Найбольш перспектыўнымі кірункамі яна лічыць гандаль, умацаванне культурных сувязяў паміж двума народамі. Акрамя таго, узаемную цікавасць выклікаюць сельская гаспадарка, высокія тэхналогіі, ахова здароўя, стварэнне інфраструктуры для развіцця электратранспарту. На думку Фіёны Гіб, задача дыпламатаў — паказаць магчымасці дзяржавы, а рашэнні прымаць ужо бізнесменам.

«Я вельмі люблю вашу краіну! Жыла ва Украіне, Германіі, Канадзе, Турцыі, Іраку, Емене, Кеніі. Цяпер жыву ў Беларусі, і дагэтуль у жыцці гэта самая любімая краіна. Вялікім гонарам было для мяне працаваць тут пaслом», — адзначыла дыпламат.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# ПА БЯЗВІЗЕ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 300 «Аб устанаўленні бязвізавага парадку ўезду і выезду замежных грамадзян». Згодна з дакументам, дзве бязвізавыя зоны для турысцка-рэкрэацыйных тэрыторый Брэста і Гродна, якія раней існавалі асобна, аб'ядноўваюцца ў адну бязвізавую тэрыторыю «Брэст — Гродна». У яе ўключаюцца яшчэ пяць раёнаў Гродзенскай вобласці: Бераставіцкі, Ваўкавыскі, Воранаўскі, Лідскі і Шчучынскі. У гэтым рэгіёне тэрмін бязвізавага знаходжання ў турыстычных мэтах павялічваецца да 15 сутак для грамадзян 73 дзяржаў.

## Парламенцкі дзённік

# Падзяка на развітанне

## Старшыня Палаты прадстаўнікоў сустрэўся з кіраўніком місіі Еўрапейскага саюза

**Андрэа Віктарын узначальвае прадстаўніцтва ЕС у Беларусі з верасня 2015 года. У гэтыя дні яна завяршае сваю місію ў нашай краіне ў сувязі з прызначэннем у Арменію. Дыпламат учора развіталася са старшынёй і дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў.**

«Вы, напэўна, ведаеце, што вы заўсёды жаданы госць у парламенце Рэспублікі Беларусь, — вітаў кіраўніка Прадстаўніцтва ЕС Уладзімір Андрэйчанка. — І таму мы сёння са шкадаваннем і нават сумам успрымаем тое, што вы завяршаеце сваю місію ў Беларусі. Шкадуем, бо за час вашай работы вельмі шмат зроблена для вываду адносін нашай краіны з Еўрапейскім саюзам на новы, больш якасны ўзровень».

Адносіны гэтыя, лічыць спікер ніжняй палаты, нармалізаваліся, і самае галоўнае — развіваюцца па многіх кірунках. Важна, што за час работы Андрэа Віктарын адбылося шмат візітаў у нашу краіну высокапастаўленых асоб, парламентарыяў Еўрапейскага саюза.

«Вы бралі вельмі актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Беларусі, — заўважыў старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Заўсёды былі на ўсіх дзяржаўных святах, вельмі шчыльна працавалі з рэгіёнамі, дапамагалі ім у выкарыстанні грантаў».

Асобна Уладзімір Андрэйчанка спыніўся на міжпарламенцкіх адносінах. «Вы ведаеце, што нашы адносіны сёння, мякка кажучы, на недастатковым узроўні. Тым не менш наша пазіцыя — іх важна развіваць, знаходзіць пункты судакранання, узаемадзеяння. Няхай нашы крокі наперад будуць невялікія, але іх трэба рабіць больш, — сказаў парламентарый. — Еўрапарламентарыі павінны разумець, што так, ёсць сёння адчувальныя пытанні, якія трэба вырашаць, і мы адкрытыя да гэтай размовы, у тым ліку і па пытаннях адмены смяротнага пакарання. Вы ведаеце, што парламент вельмі шчыльна ў гэтым кірунку працуе, нядаўна збіралася рабочая група Савета Еўропы па Беларусі і Азіі, рыхтуемся праводзіць 27 жніўня ў Беларусі сумесны з сакратарыятам Савета Еўропы семінар. Мы ў гэтым кірунку працуем, не трэба нас прыціскаць, падганяць. Думаю, што патрэбны час, і мы выйдзем на пэўнае рашэнне».

Яшчэ адзін важны аспект узаемаадносін з Еўрасаюзам — гандлёва-эканамічны. ЕС з'яўляецца другім па значнасці рынкам для беларускага экспарту. Летась з краін — членаў гэтага інтэграцыйнага аб'яднання прыцягнута 5,4 мільярда долараў інвестыцый, у тым ліку прамых — 4,6 мільярда долараў. «Мы задаволены інвестыцыйным супрацоўніцтвам з Еўропай, лічым, што сёння найлепшыя тэхналогіі — еўрапейскія, — сказаў Уладзімір Андрэйчанка. — Уся наша мяса-малочная прамысловасць працуе на нямецкім і італьянскім абсталяванні. Мы маем намер развіваць гэта. Вы бачыце, што ў апошнія гады парламент зрабіў шмат намаганняў па абароне замежных інвестараў, у цэлым па развіцці бізнесу ў Беларусі».

За апошні час добра развіваліся і гуманітарныя кантакты, супрацоўніцтва ў сферы спорту. Спікер Палаты прадстаўнікоў нагадаў Андрэа Віктарын яе словы пра тое, што да восені або восенню пагадненне паміж Беларуссю і ЕС аб спрашчэнні візавага рэжыму будзе падпісана і адбудзецца візіт у нашу краіну вярхоўнага прадстаўніка ЕС па знешняй палітыцы і палітыцы бяспекі Фрэдэрыкі Магерыні.

Андрэа Віктарын пагадзілася з тым, што за апошнія чатыры гады адносіны паміж ЕС і Беларуссю прыкметна прасунуліся наперад. «Дзякую вам і кожнаму беларускаму парламентарыю за адкрытасць. Пытанні, якія мы абмяркоўвалі, былі няпростыя, тым не менш вы заўсёды гатовыя да дыялогу, — сказала яна. — У нас было добрае супрацоўніцтва пры абмеркаванні пытанняў правоў чалавека, свабоды сходу, тэматыкі смяротнага пакарання. Гэтыя тэмы вельмі блізкія для жыхароў Еўрапейскага саюза, і я зноў хачу падкрэсліць вашу гатоўнасць да ўзаемадзеяння».

Прадстаўнік ЕС заявіла: «Мы зацікаўленыя ў тым, каб Беларусь была свабоднай, незалежнай, суверэннай краінай з квітнеючай эканомікай. Краінай, у якой у павазе правы чалавека, забяспечваюцца прынцып вяршэнства права, дэмакратычныя каштоўнасці. І мы жадаем развіваць супрацоўніцтва ва ўсіх сферах. Еўрапейскі саюз пацвярджае і прызнае канструктыўную пазіцыю, якую Беларусь займае на міжнароднай арэне па пытаннях урэгулявання крызісу ва Украіне. Мы прызнаем ваш унёсак у забеспячэнне міру ў вашым рэгіёне. Мы таксама цэнім супрацоўніцтва Беларусі ў рамках «Усходняга партнёрства» і бачым рост зацікаўленасці Беларусі ў гэтым праекце».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Тэлефонная размова Зяленскага і Пуціна

Уладзімір Пуцін сваім уплывам павінен спыніць забойства ўкраінскіх салдат ваеннымі самаабвешчаных рэспублік Данбаса. Пра гэта, як паведамляе УНІАН, прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну падчас тэлефоннай размовы заявіў яго ўкраінскі калега Уладзімір Зяленскі.

Учора міністэрства абароны Украіны паведаміла пра гібель у Данбасе ў выніку абстрэлу чацвярых ваеннаслужачых УСУ.

У сераду прэзідэнт Зяленскі сабраў у гэтай сувязі нараду з прадстаўнікамі шэрагу падраздзяленняў Узброеных сіл, начальнікам Генеральнага штаба і сакратаром Савета нацыянальнай бяспекі і абароны. Па яе выніках прэзідэнт даў брыфінг, падчас якога паведаміў, што раніцай патэлефанаваў Пуціну, каб абмеркаваць абвастрэнне сітуацыі ў Данбасе.

«Я папрасіў паўплываць на той бок, каб яны перасталі забіваць нашых людзей», — сказаў Уладзімір Зяленскі.

Ноччу народная міліцыя Данецкай народнай рэспублікі распаўсюдзіла экстранную заяву, у якой абвінаваціла Украіну ў падрыхтоўцы да актыўных баявых дзеянняў.

## Кім Чэн Ын асабіста кіраваў выпрабаваннямі новых тактычных кіраваных ракет

КНДР 6 жніўня правяла запускі новых тактычных кіраваных ракет пад асабістым кіраўніцтвам лідара краіны Кім Чэн Ына. Пра гэта паведаміла ў сераду агенцтва Yonhap са спасылкай на паўночнакарэйскае агенцтва ЦТАК.

«Старшыня Дзяржсавета КНДР Кім Чэн Ын асабіста кіраваў пускамі новых тактычных кіраваных ракет», — прыводзіць Yonhap паведамленне ЦТАК.



Па выніках выпрабаванняў Кім Чэн Ын, які за імі назіраў, заявіў, што ракетныя пускі «сталі магчымасцю накіраваць папярэджанне ў сувязі з сумеснымі ваеннымі вучэннямі», якія праводзяцца Паўднёвай Карэяй і ЗША.

## Бельгіец выпадкова купіў у бары карціну Рэмбранта за €500

І толькі нядаўна жыхар Льежа высветліў, што карціна, набытая ім 10 гадоў таму ў бары ў незнаёмца за €500, каштуе больш за €30 млн. Пра гэта паведамляе газета The Brussels Times.

«Каля 10 гадоў таму, падчас выпадковай сустрэчы ў бары ў горадзе Герсталь (правінцыя Льеж), мужчына завязаў размову з незнаёмым, які меў фінансавыя цяжкасці. Пасля гэтай размовы бельгіец вырашыў дапамагчы свайму новаму знаёмаму і купіў у яго карціну з выявай Ісуса за €500», — піша выданне.

Пасля мужчына паказаў гэтую карціну свайму знаёмаму, які з'яўляецца спецыялістам у галіне мастацтваў, і той выказаў здагадку, што работа можа каштаваць значна даражэй, чым за яе заплачана. Карціну аддалі на экспертызу, і яна паказала, што твор каштуе больш за 30 мільёнаў еўра. Як адзначылі спецыялісты, на карціне прысутнічаюць дэталі, характэрныя для работ Рэмбранта ван Рэйна.

Па паведамленнях партала Sudinfo, уладальнік карціны прыняў рашэнне выставіць яе на продаж, а атрыманыя грошы інвеставаць у свой любімы футбольны клуб.

**Открытое акционерное общество «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»** (Республика Беларусь, 246008, г. Гомель, ул. Лещинская, 49) сообщает, что внеочередным общим собранием акционеров данного общества, состоявшимся 06.08.2019, принято решение о выплате дивидендов за первое полугодие 2019 года – 0 рублей 64 копейки на одну простую (обыкновенную) акцию.

Выплата дивидендов по акциям будет производиться с 06.08.2019 по 31.12.2019.

Порядок выплаты дивидендов акционерам:

- юридическим лицам – путем зачисления на их расчетные счета,

- физическим лицам дивиденды выплачиваются через кассу ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» или высылаются почтовым переводом (в пределах Республики Беларусь).

УНП 400078768

**Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю Аляксандра Кірылавіча КАРАБАНАВА, акадэміка, доктара геолага-мінералагічных навук, прафесара, дырэктара ДНУ «Інстытут природакарыстання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», выказвае глыбокія спачуванні родным і блізкім.**

# ЯКІМІ БУДУЦЬ АДКАЗЫ НА ЖЫЛЛЁВЫЯ ПЫТАННІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах міністра, становучая тэндэнцыя па павелічэнні колькасці шматдзетных сем'яў скарэктавала планы ведамства. Таму развіваецца яшчэ адзін кірунак — індывідуальнае будаўніцтва. Мінбудархітэктуры прадставіла прыклады такіх жылых дамоў, магчымых для будаўніцтва ў індустрыяльным выкананні. У гэтай тэме сёння задача ведамства — выйсці на сабекошт квадрата такога жылля, суадносны з цаной, калі б дом будаваў сам жыхар.

За апошнія восем гадоў чарга для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, паменшылася на 190 тысяч чалавек. Але праблема ўсё яшчэ актуальная — у гэтай чарзе больш за 600 тысяч сем'яў.

Будаўніцтва жылля для тых, хто мае патрэбу, знаходзіцца на кантролі і ў плане цаны, і ў плане аб'ёмаў. Сярэдні кошт квадратнага метра для гэтай катэгорыі — 880 рублёў пры сярэднім заробку па краіне 1043 рублі. Такія суадносіны захаваюцца і да канца года.

Чаргавікі сталіцы будуць накіроўвацца на будаўніцтва жылля ў гарады-спадарожнікі. А фінансаванне развіцця іх інфраструктуры ўскладзена на Мінск. Першымі для пілотнага праекта абраны Смалявічы, пасля акцэнт зробяць на Рудзенск.

«Попыт на такое жыллё ёсць, як паказала практыка па першым жылым доме ў Смалявічах. Ён перавышае прапанову ў некалькі разоў, таму мы бачым, што гэтая работа дасць свае вынікі», — пракаментаваў Дзмітрый Мікулёнак.

Да 74 % павялічылася загрузка заводаў міністэрства, якія ствараюць індустрыяльныя канструкцыі. Ёсць станоўчая дынаміка і ў рэнтабельнасці прадпрыемстваў: яна сёлета складае ў сярэднім 5 %.

«Канешне, мы лічым, што гэтага недастаткова. Парогавай з'яўляецца лічба не менш за 10 %, — падкрэсліў міністр. — У цэлым уклад будаўніцтва ў фарміраванне ВУП краіны вырас да 5,5 % у 2019 годзе. Ён расце паступальна, і залежыць усё, у прынцыпе, ад інвестыцый, якія ўкладваюцца цяпер у будаўніцтва рознага роду».

Мінбудархітэктуры плануе страхаваць адказнасць праектнай арганізацыі за распрацаваную дакументацыю. Ведамства пакуль не можа знайсці агульную мову са страхавымі кампаніямі.

«Самае галоўнае пытанне: што мы страхуем? Ці мы страхуем дзейнасць праектнай арганізацыі, ці дзейнасць канкрэтнага праекціроўшчыка, ці страхуем аб'ект, які праектуецца? Усё залежыць ад гэтага, у тым ліку і лічбы страхоўкі. Мы прытрымліваемся думкі, што трэба страхаваць дзейнасць у цэлым праектнай арганізацыі. Такая страхоўка павінна быць нейкі пэўны перыяд, можа два ці тры гады, — адзначыў Дзмітрый Мікулёнак. — Калі арганізацыя будзе прэтэндаваць на атрыманне атэстата на аб'екты другой-першай катэгорыі (гэта тыя, што з'яўляюцца сур'ёзнымі з пункту гледжання будаўніцтва), значыць, яна павінна мець страхавы поліс на выпадак сваіх памылак. Я думаю, што да канца года мы гэту тэму праціснем. Яна вельмі сур'ёзная, наракання ў да праектных арганізацый вельмі шмат, і справядлівых».

Міністр паведаміў, што амаль гатова да падпісання пастанова, якая рэгулюе парадак прыняцця будаўнічых нормаў і правілаў: «Я думаю, на працягу бягучага і наступнага гадоў мы скончым фарміраванне на 90 % новых будаўнічых нормаў і будаўнічых правілаў, якія ўбяруць у сябе ўсе нарматывы, звязаныя з будаўніцтвам і праектаваннем аб'ектаў, што сёння падзелены ў тым ліку паміж рознымі рэгулятарамі акрамя нас. Гэта Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства надзвычайных сітуацый, Міністэрства энергетыкі, транспартнікі і іншыя. Усё гэта будзе выбрана ў адны будаўнічыя нормы, якія сканцэнтруюцца ў адным дакуменце».

Налета плануецца пабудаваць каля 46 тысяч квадратаў жылля, дзе для ацяплення і гарачага водазабеспячэння будзе выкарыстоўвацца электрычная энергія. Адпаведны нарматыўны акт у выглядзе будаўнічых правіл, які рэгламентуе праектаванне такіх аб'ектаў, ужо рыхтуецца.

Будаўнічая галіна ў рэспубліцы сёння прадстаўлена больш чым 10 тысячамі арганізацый, 60 % з іх — прыватныя. У сферы працуе 151 тысяча чалавек. Сярэдні заробак спецыялістаў — 1148 рублёў, што складае 123 % у параўнанні з мінулым годам. Ідзе выраўноўванне заробкаў у суадносінах з прадукцыйнасцю працы, якая ўзрасла на 116 %. Агульны экспарт тавараў па галіне за паўгоддзе ацэньваецца ў 240 мільёнаў долараў ЗША.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# «Я НЕ БАЧУ СЯБЕ НА АЛІМПІЯДЗЕ»

## Аляксандра Герасіменя абвясціла аб завяршэнні кар'еры

**Плыўчыха за сваю кар'еру заваявала два сярэбраныя медалі на летніх Гульнях у Лондане на 50 і 100 метраў вольным стылем, а ў Рыа-дэ-Жанейра на дыстанцыі 50 метраў вольным стылем выйграла бронзавы медаль.**



Фота БелТА.

«Я, як ніхто іншы, хацела паехаць на Алімпійскія гульні ў Токіа. Але сёння я не гатовая ўзяць медаль. І калі быць шчырай з самой сабой, я не бачу сябе на Алімпіядзе. Будзе сумленна сказаць, што я завяршаю спартыўную кар'еру. Але не адыходжу ад спорту наогул. У мяне ёсць свой спартыўны клуб, шмат праектаў. Маё рашэнне ўзважанае і ўсвядомленае. Паверце, гэта не капрыз, а дакладнае разуменне сітуацыі. У нас у зборнай ёсць надзейная апора, ёсць спартсмены, гатовыя спаборнічаць на міжнародным узроўні. Думаю, што яны будуць таксама гатовыя паказваць добрыя секунды на Алімпійскіх гульнях».

Нагадаем, Аляксандра таксама з'яўляецца чэмпіёнкай свету 2011 года на дыстанцыі 100 метраў вольным стылем і ўладальніцай залатога медаля сусветнага форуму 2012 года ў 25-метровым басейне. У жніўні 2017 года Аляксандра Герасіменя выйшла замуж за плыўца Яўгена Цуркіна, а ў верасні 2018-га нарадзіла дачку Соф'ю, адзначыўшы, што гэта ее самая важная ўзнагарода ў жыцці.

### ❍ У ТЭМУ

Алімпійская чэмпіёнка Надзея Скардзіна чакае дзіця. Нагадаем, 34-гадовая беларуская біятланістка ў чэрвені 2018 года аб'явіла аб завяршэнні прафесійнай кар'еры ў біятлоне. Апошні раз яна выступіла ў «Гонцы легенд» у Раўбічах у лютым 2019 года. Акрамя алімпійскага золата 2018 года ў эстафеце, Надзея заваёўвала Кубак свету ў індывідуальных гонках, шэсць разоў падымалася на п'едэстал у індывідуальных кубкавых гонках і сем разоў — у кубкавых эстафетах. Акрамя таго, яна была бронзавым прызёрам Гульняў у Сочы.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Праблема

# 55 ЧАЛАВЕК ЗАГІНУЛА СЁЛЕТА АД РУК СВАІХ БЛІЗКІХ

**З 29 ліпеня да 3 жніўня Міністэрства ўнутраных спраў праводзіла ў Беларусі акцыю «Побыт». Звязана гэта было з тым, што ў нашай краіне прыкметна вырасла колькасць цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, якія адбываюцца ў сям'і. Толькі за першыя сем месяцаў хатнія агрэсары забілі 55 чалавек, якія жылі разам з імі і вялі агульную гаспадарку. Такую лічбу агучыў на брыфінгу намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку, начальнік упраўлення прафілактыкі МУС Алег КАРАЗЕЙ.**

Гэтая лічба перавышае паказчыкі, зарэгістраваныя летась. Тады па стане на 1 жніўня ад рук сваіх блізкіх загінула 48 чалавек. 80 % віноўнікаў такіх злачынстваў — мужчыны. Пры гэтым пяць з кожных шасці цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў былі ўчынены ў стане алкагольнага ап'янення.

— Калі разглядаць усю статыстыку пацярпелых у сям'і, то мужчын і жанчын прыблізна пароўну, — працягвае Алег Каразей. — Але што да забойстваў і нанясення цяжкіх цялесных пашкоджанняў, то тут на долю слабага полу прыпадае ўжо каля трэці такіх злачынстваў. Чаму так выходзіць? Шмат канфліктаў у сям'і ідзе па нарастаючай. Папрокі змяняюцца пабоямі, у нейкі момант напружанне дасягае крытычнай адзнакі. Паколькі фізічна жанчына слабейшая, то яна бярэ нож і робіць фатальны замах.

І часцяком алкаголь «дапамагае» ў гэтай справе. Летась Інстытут сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук правёў цікавае апытанне сярод жанчын, якія пацярпелі ад гвалту ў сям'і. Яны сказалі, што алкаголь — галоўная, але не выключная прычына гвалту. Сярод астатніх — рэўнасць, жаданне паказаць, хто гаспадар, матэрыяльныя праблемы... А гэта ўсё сведчыць пра тое, што ў сям'і ненармальна выбудаваны адносіны. Таму, на думку праваахоўнікаў, ранні зварот па дапамогу можа захаваць сям'ю на стадыі, пакуль канфлікт не дайшоў да рукапрыкладства.

— За год мы атрымліваем да 100 тысяч выклікаў ад ахвяр скандалаў, — заўважыў Алег Каразей. — Мы абавязкова выедзем, прымем усе неабходныя захады. Але гэта ўжо вынік. А змагацца трэба з прычынай. Так, на прафілактычным уліку ў краіне стаіць амаль восем тысяч хатніх скандалістаў. Але гэта гаворка ідзе пра тых, каго пакаралі рублём паўторна. Агулам жа за год у гэтай сферы рэгіструецца прыблізна 50 тысяч адміністрацыйных правапарушэнняў. Чаму ўзнікае амаль двухразовая розніца ў параўнанні з колькасцю выклікаў? Па-першае, адміністрацыйная адказнасць узнікае па патрабаванні пацярпелых. Бывае, што жанчына кажа: «Вы дасце штраф, а плаціць нам яго з нашага сямейнага бюджэту». У шэрагу выпадкаў мы выкарыстоўваем дапамогу пракурора, калі кажам пра сітуацыю, калі жанчына знаходзіцца ў залежным стане і не можа самастойна абараніць свае правы. Тады мы пачынаем адміністрацыйны або крымінальны працэс.

Пры гэтым на вёсцы адносная колькасць выпадкаў хатняга гвалту ў пераліку на 10 тысяч чалавек амаль у два разы вышэйшая, чым у гарадской забудове. Адбітак на гэта накладвае лад жыцця. Шмат хто з агрэсараў нідзе не працуе або мае прафесію, звязаную з нізкай кваліфікацыяй, але вельмі ахвотны да спіртнога. Слова за слова — і далей панеслася па накатанай...

Разам з тым існуе прававая калізія, якая вымушае МУС шукаць дадатковыя механізмы процідзеяння гвалту ў сям'і.

— Скажам, муж і жонка развяліся. Але не раз'ехаліся і жывуць паасобку кожны ў сваім пакоі. Калі паміж імі адбудзецца канфлікт, то лічбы хатняга гвалту не вырастуць, таму што перад намі не сям'я. Але варта было б пашырыць закон аб супрацьдзеянні хатняму гвалту і на такія выпадкі, — лічыць Алег Каразей. — Тым больш што ёсць рэальныя прыклады. Некалькі гадоў таму ў Гомельскай вобласці жанчына звярнулася да нас увесну з нагоды агрэсіі з боку былога мужа. Яго мы прыцягнулі да адказнасці. У верасні жанчына пачула ў свой адрас пагрозу забойствам. З аднаго боку, злачынства сур'ёзнае. Але з пункту гледжання заканадаўства максімальная санкцыя ў такім выпадку — да двух гадоў пазбаўлення волі. А гэта значыла, што следчы не мае права прымяніць меру стрымання ў выглядзе зміяшчэння пад варту. І вось адбыўся чарговы скандал, падчас якога жанчына была выкінута з акна...

Магчыма, прававыя нормы і не змаглі б прадухіліць трагедыю. Разам з тым, як зазначыў Алег Каразей, наяўнасць механізмаў, якія дазваляюць упльваць на падобныя сітуацыі, важная для аказання своечасовай дапамогі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Напярэдадні падзеі

# БІТВА КАНТЫНЕНТАЎ

## Адраджэнне легендарнага лёгкаатлетычнага матча адбудзецца ў Мінску 9—10 верасня

**Матчавая сустрэча Еўропа—ЗША — падзея, якая не мае аналагаў, названыя кантынентамі на бегавых дарожках у такім фармаце яшчэ не сустракаліся, калі не лічыць матчавыя сустрэчы камандаў СССР і ЗША, якія ў свой час былі вельмі папулярныя. Апошняя падобная лёгкаатлетычная бітва прайшла якраз такі на мінскім стадыёне «Дынама» 46 гадоў таму.**

Ініцыятарам правядзення Матча Еўропа — ЗША стаў Прэзідэнт Еўрапейскай лёгкаатлетычнай асацыяцыі Свен Арнэ Хансен, беларуская федэрацыя лёгкай атлетыкі з радасцю падтрымала гэтую ідэю. У праграме цяперашняга матча ў Мінску — усе віды лёгкай атлетыкі, акрамя доўгіх дыстанцый (больш за тры тысячы метраў) і эстафеты 4x400 метраў. У кожным відзе праграмы выступяць па восем атлетаў (чатыры прадстаўнікі ад Еўропы і чатыры — ад ЗША). Канчатковы склад зборных кантыненты назавуць 1 верасня. У Беларусь прыедуць топавыя спартсмены сусветных рэйтынгаў — гэта 304 наймацнейшыя атлеты свету. Плануецца, што ў камандзе Еўропы выступіць дзесяць беларускіх спартсменаў.

*«Увагу да матча з боку дзяржаўнага кіраўніцтва, асабіста кіраўніка дзяржавы, немагчыма пераацаніць,* — адзначыў **намеснік міністра спорту і турызму Беларусі Аляксандр БАРАУЛЯ.** — *Павінен паведаміць, што асабіста намеснікам прэм'ер-міністра Ігарам Петрышэнкам быў створаны арганізацыйны камітэт, які планава вядзе работу па падрыхтоўцы да гэтай грандыёзнай падзеі. Таму можна зразумець, наколькі дадзены матч значны для Беларусі і наколькі сур'ёзна падыходзіць дзяржава да пытанняў яго арганізацыі. Сам матч — безумоўна і без перабольшання гістарычны момант, бо ў гісторыі суверэннай Беларусі падобных спаборніцтваў яшчэ не праводзілася. Наймацнейшыя атлеты з Еўропы і ЗША яшчэ не сустракаліся на беларускай зямлі, і я думаю, што гледачы, аматары лёгкай атлетыкі не пашкадуюць, калі прыйдуць на стадыён».*

Спартыўную падзею будуць асвятляць найбуйнейшыя СМІ з усяго свету, напрыклад, правы на трансляцыю форуму ўжо купіла кампанія ВВС. Што да гледачоў, дык білетная праграма была запушчана яшчэ ў маі, запаветныя білеты працягваюць прадавацца і цяпер, іх мінімальная цана — 12 рублёў, найвышэйшая — 25 рублёў.

Ужо вядома, што з сусветных зорак у матчы выступіць чэмпіён свету ў бегу на 200 метраў Раміль Гуліеў, неаднаразовая чэмпіёнка свету і Еўропы ў скачках у вышыню Марыя Ласіцкене і алімпійская чэмпіёнка ў скачках з шастом Кацярына Стэфанідзі. *«Узровень матча будзе вельмі высокім, і толькі топ-атлеты возьмуць у ім удзел. Радуе, што ў Беларусі ёсць гарантаваная квота ў колькасці дзесяці месцаў у камандзе Еўропы, але мы не выключаем магчымасці і прамога праходжання ў каманду»,* — адзначыў **старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

Пераможцы турніру атрымаюць па сем тысяч еўра прызавых, удзельнікі, якія занялі другія месцы, — па пяць тысяч, трэція — па чатыры тысячы. Па словах Вадзіма Дзевятоўскага, ад узроўню арганізацыі матча будзе залежаць лёс беларускай заяўкі на правядзенне чэмпіянату Еўропы па лёгкай атлетыцы ў 2024 годзе. Гаспадар кантынентальнага турніру будзе абраны ў 2020 годзе. Акрамя Мінска, на яго прэтэндуе польскі рэгіён Сілезія. Раней з барацьбы выбылі Гётэбарг (Швецыя) і Тамперэ (Фінляндыя).

Плануецца, што лёгкаатлетычны матч Еўропа — ЗША стане традыцыйным і будзе праводзіцца раз на два гады (у 2021 годзе — у ЗША, у 2023-м — у Еўропе і г. д.).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# У Мінпрацы прапісалі, як звяртацца па пенсію

**З 4 жніўня ўступіла ў сілу пастанова Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ад 8 ліпеня 2019 г. № 35 «Аб парадку звароту па пенсію і арганізацыі работы і вядзення справаводства па прызначэнні і выплаце пенсій».**

Як паведамляюць у ведамстве, гэтай пастановай зацверджана інструкцыя аб парадку звароту па пенсію і арганізацыі работы і вядзення адпаведнага справаводства. Па сваёй сутнасці гэты дакумент дэталёва рэгламентуе парадак арганізацыі работы па пенсійным забеспячэнні.

Так, што датычыцца звароту па пенсію, то агульны падыход — падача заявы і дакументаў, неабходных для прызначэння пенсіі ва ўпраўленне па сацыяльнай абароне па месцы жыхарства грамадзяніна: грамадзянам, якія працуюць, — праз работадаўцу, непрацуючым грамадзянам — непасрэдна імі самімі.

У дачыненні да асобных катэгорый грамадзян (непаўналетніх, недзеяздольных), якія не могуць непасрэдна самі звярнуцца па пенсію, заява і дакументы падаюцца іх упаўнаважаным прадстаўніком ва ўпраўленне па сацыяльнай абароне па месцы жыхарства (месцы знаходжання).

Зварот па прызначэнне пенсіі можа ажыццяўляцца ў любы час пасля ўзнікнення права на пенсію без абмежавання нейкім тэрмінам.

Каб грамадзянін мог своечасова рэалізаваць свае права на пенсійнае забеспячэнне, з'явілася правіла: пры супадзенні тэрміну звароту за пенсіяй, абумоўленага дасягненнем пенсійнага ўзросту і ўзнікненнем права на пенсію з выхаднымі днямі або дзяржаўнымі святамі і святочнымі днямі, абвешчанымі непрацоўнымі, заява аб прызначэнні пенсіі можа быць прынята напярэдадні гэтых дзён. Пры гэтым умова дасягнення пэўнага ўзросту лічыцца выкананай у дзень, адпаведны даце нараджэння.

Акрамя таго, як паведамілі ў Мінпрацы і сацабароны, актуалізавана (фармалізавана) форма заявы аб прызначэнні пенсіі. У ёй павінны быць адлюстраваны звесткі пра асобу, якая звярнулася па пенсію асабіста альбо пра яе прадстаўніка, паказаны абраны спосаб атрымання пенсіі, указаны звесткі, якія могуць паўплываць на пенсійнае забеспячэнне (аб рабоце, атрыманні пенсіі, праходжанні службы, дзецях і да т. п.), падрабязны пералік акалічнасцяў, пра надыход якіх заяўнік абавязаны праінфармаваць орган, што ажыццяўляе пенсійнае забеспячэнне.

Пералік дакументаў, неабходных для прызначэння пенсій, спрошчаны, каб не было паўтораў (дубліравання) адных і тых самых дакументаў у дачыненні да розных відаў пенсій.

**Святлана БУСЬКО.**

**Сярэдні памер прызначаных месячных пенсій у жніўні гэтага года склаў 432,27 рубля, сярэдні памер прызначаных пенсій па ўзросце — 446,84 рубля.**

# ГАСЦЕЙ ЧАКАЮЦЬ І З РАСІІ, І З ВЯЛІКАБРЫТАНІІ



**На Гродзеншчыне, у Жыровічах, пройдзе круглы стол «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго» — сярод ключавых мерапрыемстваў Дня беларускага пісьменства, які сёлета ладзіцца ў Слоніме і яго ваколіцах. Нагадаем, што круглы стол — даўняя традыцыя, якая запачаткавана ў 2007 годзе. Арганізатарамі праекта штогод выступаюць Міністэрства інфармацыі, Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура» і Саюз пісьменнікаў Беларусі.**

Ужо вядома, што ўдзел у сёлетняй сустрэчы паэтаў, празаікаў, публіцыстаў, літаратуразнаўцаў, крытыкаў, перакладчыкаў прымуць літаратары з Азербайджана, Вялікабрытаніі, Грузіі, Індыі, Казахстана, Кітая, Літвы, Малдовы, Польшчы, Расіі, Сербіі, Узбекістана, Украіны. Шмат хто з гасцей не ўпершыню прыязджае ў Беларусь. Публіцыст, літаратуразнавец, краязнавец, перакладчык Глеб Кудрашоў з Палтавы (Украіна) шмат асабіста робіць для ўмацавання беларуска-ўкраінскіх літаратурных, культурных, увогуле гуманітарных сувязяў. Не меней актыўнай у сваёй увазе да беларускай літаратуры з'яўляецца празаік, перакладчык з Узбекістана Рысалат Хайдарава. Дзякуючы яе намаганням у далёкай ад Беларусі цэнтральнаазіяцкай краіне з'яўляюцца ўсё новыя і новыя публікацыі твораў беларускіх пісьменнікаў у перакладзе на ўзбекскую мову. Сталым удзельнікам круглых сталоў у рамках Дня беларускага пісьменства з'яўляецца дзіцячы пісьменнік з Літвы Яронімас Лаўцюс. Часопіс «Зорачка», які ён рэдагуе ў Вільнюсе, не аднойчы аддаваў свае старонкі беларускай дзіцячай літаратуры. І сам Яронімас Лаўцюс — добра знаёмы беларускаму чытачу аўтар. Многія яго кнігі пабачылі свет у Мінску на беларускай і рускай мовах.

Па традыцыі прыязджае вялікая дэлегацыя з Казахстана — на чале з загадчыкам аддзела аналітыкі і знешніх літаратурных сувязяў Інстытута літаратуры і мастацтва імя М. А. Аўэзава Міністэрства навукі і адукацыі кандыдатам філалагічных навук Святланай Ананьевай. У Беларусі і Казахстана ў апошнія гады з'явілася шмат пунктаў судакранання ў часткі арганізацыі беларуска-казахскіх літаратурных сувязяў. Выходзяць у Алмаце і Нур-Султане, іншых гарадах Казахстана творы беларускіх пісьменнікаў у перакладзе на казахскую мову. Адна са школ горада Мінска носіць імя Мухтара Ауэзава — класіка казахскай літаратуры. За апошнія дзесяць-пятнаццаць гадоў многія казахскія пісьменнікі пабывалі ў Мінску, у розных гарадах Беларусі. Гэта і Мурат Аўэзаў, сын легендарнага літаратара, культуролаг, публіцыст, і Алжас Сулейменаў, і Кайрат Бакбергенаў, і Любоў Шашкова, і Валерый Міхайлаў, і Нурдаўлет Акыш, і шмат хто яшчэ. Што адметна, сустрэчы, дыялогі, дыскусіі, якія адбываюцца на пляцоўцы круглага стала «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго», становяцца своеасаблівай дарогай для наладжвання сувязяў казахстанскіх і беларускіх літаратуразнаўцаў. Пра гэта сведчаць дзясяткі навуковых, навукова-публіцыстычных публікацый у перыёдыках Казахстана і Беларусі. І сёлета казахскія госці правядуць у Мінску шэраг мерапрыемстваў і па-за рамкамі круглага стала. Гэта — і прэзентацыі, і сустрэчы з літаратурнай моладдзю, іншыя імпрэзы, перамовы. Усё спланавана дзеля таго, каб нашы старонкі, нашы краіны былі бліжэйшыя адна да адной, пашыралі свае адносіны ва ўсіх сферах жыццядзейнасці.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Адукацыя

# ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА: ПЕРСПЕКТЫВЫ І ПЛАНЫ




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Колькасць іншагародніх студэнтаў сталічных ВНУ, забяспечаных месцамі ў інтэрнатах, прыцягвае павялічваць, чаму спрыяе як скарачэнне студэнцкага кантынгенту за апошнія гады, так і ўвод у эксплуатацыю новых інтэрнатаў.**

Так, у верасні ў Студэнцкай вёсцы прыме сваіх першых жыхароў яшчэ адзін інтэрнат, разлічаны на 1800 месцаў (ён самы буйны). І хоць курыруе яго БДЭУ, жыць там будуць студэнты з розных устаноў адукацыі, у тым ліку і з Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, у якіх раней не было свайго жылплошчы ў вёсцы.

— На 1 верасня ў Мінску будуць забяспечаны інтэрнатамі як мінімум 70 працэнтаў ад агульнай колькасці тых, хто мае ў гэтым патрэбу, — паведаміў на сустрэчы з журналістамі **начальнік Галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ**. — А ў найбліжэйшых планах — давесці гэтую лічбу ў цэлым да 90 працэнтаў. Ужо сёння шэраг ВНУ забяспечваюць сваіх студэнтаў месцамі ў інтэрнатах на 100 працэнтаў, напрыклад БДАТУ, Акадэмія кіравання, Акадэмія сувязі, Акадэмія авіяцыі, Ваенная акадэмія... Блізкія да поўнага вырашэння праблемы БДПУ, БДУ, МДЛУ. Што датычыцца рэгіёнаў, то цяпер завяршаецца будаўніцтва інтэрната для навучэнцаў Гродзенскага медуніверсітэта.

## Што будзе з гуманітарным блокам?

Па словах Сяргея Каспяровіча, у новым навучальным годзе будзе істотна абноўлены змест вышэйшай адукацыі. Толькі за апошнія паўгода былі прынятыя 84 новыя адукацыйныя стандарты па розных спецыяльнасцях для першай ступені вышэйшай школы, распрацаваны новыя падручнікі, перагледжаны падыходы да функцыянавання магістратуры: яна будзе працаваць у новым фармаце, па новым змесце і арыентавацца на задавальненне патрэб у кадрах навуковай і інавацыйнай сфер. Таксама ў магістратуры будуць рыхтавацца педагагічныя кадры для сістэмы адукацыі. Па інфармацыі Міністэрства адукацыі, штогод адбываецца абнаўленне кадравага складу ў вышэйшай школе прыблізна на 5—10 працэнтаў.

Увогуле змест адукацыі выходзіць на першы план пры падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, якія павінны адпавядаць патрэбам рынку працы. Датычыцца гэта цалкам розных спецыяльнасцяў: тэхнічных, педагагічных, гуманітарных... Але прыняццем новых адукацыйных стандартаў абнаўленне зместу адукацыі не абмяжоўваецца (яны могуць абнаўляцца раз у некалькі гадоў, а патрэбы работадаўцаў змяняюцца хутчэй). У адукацыйных стандартах прапісаны толькі дзяржаўны кампанент. ВНУ ў рамках акадэмічнай свабоды могуць і самі абнаўляць шэраг дысцыплін. Гэтыя пытанні яны вырашаюць ва ўзаемадзеянні з заказчыкамі кадраў. Цяпер на варыятыўны кампанент адводзіцца 20 % у вучэбных планах першай ступені. У новым Кодэксе аб адукацыі плануецца павялічыць яго да 50 %. А ў магістарскіх адукацыйных праграмах на ўзроўні стандарту будзе фіксавацца і ўвогуле толькі 30 працэнтаў іх напаўнення, а 70 % — адвадаваца ВНУ.

Сяргей Каспяровіч паведаміў, што цяпер абмяркоўваецца новая канцэпцыя блока сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Нягледзячы на скарачэнне тэрмінаў падрыхтоўкі спецыялістаў на першай ступені, гэты блок не скарачаецца, але яго структуру плануецца мадэрнізаваць: перайсці ад модульнага да больш простага прадметна-дысцыплінарнага блока з вялікай варыятыўнай часткай і ўвязаць веды, якія будуць атрымліваць студэнты ў рамках сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, з прафесійнай траекторыяй будучага спецыяліста.

У новым навучальным годзе працягнецца рэалізацыя канцэпцыі «Універсітэт 3.0». Раней у праекце ўдзельнічалі сем ВНУ, цяпер да іх далучыцца яшчэ і Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт. Мэта праекта — сфарміраваць у студэнцкай моладзі прадпрымальніцкія кампетэнцыі, ствараць у ВНУ бізнес-асяроддзе, у якім будуць нараджацца і ўвасабляцца ў жыццё цікавыя тэхнічныя, тэхналагічныя і навуковыя ідэі.

## Акцэнт — на псіхалагічную бяспеку

Адзін з удзельнікаў праекта «Універсітэт 3.0» — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі.

— У змест больш чым 20 дысцыплін мы ўнеслі змены — улічылі пытанні па бізнес-планаванні, інжынерна-эканамічнай падрыхтоўцы, кіраванні інтэлектуальнай уласнасцю, камерцыялізацыі вынікаў навуковых даследаванняў, фарміраванні аналітычных кампетэнцый, — патлумачыў **рэктар БДУІР Вадзім БОГУШ**. — Акрамя таго, мы фактычна перазапускаем работу нашага студэнцкага бізнес-інкубатара, дзе маладыя людзі змогуць не толькі абмеркаваць свае ідэі, стварыць бізнес-план, але і паўдзельнічаць у рэспубліканскіх і ўніверсітэцкім конкурсах на атрыманне грантавай падтрымкі. Такая пляцоўка дазваляе прадпрымальнікам-пачаткоўцам ацаніць, наколькі іх ідэя можа быць камерцыялізавана і рэалізавана на практыцы.

Абнавілі навучальныя планы па ўсіх спецыяльнасцях на 2019/2020 год і ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка.

— Мы ўнеслі дапаўненні, звязаныя з узмацненнем псіхолага-педагагічнай падрыхтаванасці нашых выпускнікоў. Напрыклад, з'явіўся факультатыўны курс, прысвечаны псіхалагічнай бяспецы ў школе. Ён актуальны для ўсіх спецыяльнасцяў, — падкрэсліў **прарэктар па вучэбнай рабоце БДПУ Аляксандр МАКАЎЧЫК**.

## Новыя цэннікі

Адказваючы на пытанні журналістаў наконт даволі адчувальнага павышэння кошту платнага навучання за апошнія гады, Сяргей Каспяровіч патлумачыў: «Кошт фарміруецца зыходзячы з аб'ектыўных фактараў, а менавіта з эканамічна абгрунтаваных выдаткаў на падрыхтоўку спецыяліста. Вучэбныя планы на розных спецыяльнасцях маюць розную працаёмкасць у засваенні праграмы: дзесьці аўдыторная нагрузка большая, а дзесьці — меншая. Большая частка грошай ідзе на аплату рыботы выкладчыкаў. Таксама сродкі ідуць на аплату камунальных паслуг універсітэта, абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы і іншыя выдаткі. У структуры выдаткаў аплата работы выкладчыкаў дасягае 80 працэнтаў. Калі параўнаць індэкс цэн коштаў на адукацыйныя паслугі, то яны нават адстаюць ад індэкса росту цэн на іншыя паслугі».

Сяргей Каспяровіч запэўніў, што рэктары ВНУ прымаюць вельмі ўзважаныя рашэнні аб павышэнні платы за навучанне, якія ўзгадняюцца з Міністэрствам адукацыі. «Мы разумеем, што студэнтам складана сябе забяспечваць, — падкрэсліў ён. — Але прырост адбываецца па аб'ектыўных прычынах, і ён мінімальны».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

❍ ДАРЭЧЫ

## Каму дадуць адтэрміноўку?

Прыемная навіна прыйшла для тых, хто сёлета паступаў ва ўстановы адукацыі. Прэс-служба Міністэрства абароны паведаміла, што прызыўнікі, залічаныя на вучобу да 10 жніўня, могуць скарыстацца сваім правам на адтэрміноўку ад прызыву на тэрміновую ваенную службу і службу ў рэзерве. Падстава — працяг адукацыі. Гэта значыць, што для іх у гэтым выпадку дзейнічаюць ранейшыя нормы Закона «Аб воінскім абавязку і воінскай службе».

Такое рашэнне прынята зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі з максімальным улікам інтарэсаў грамадзян. Усё, што трэба будзе зрабіць юнакам-студэнтам, — падаць неабходныя дакументы ў прызыўную камісію.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

8 ЖНІЎНЯ 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 13 (15868)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Вольга МАСТАЎНІКОВА:

# «Мяне абараняе дух айкідо»



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Яна — выкладчык айкідо з дваццацігадовым стажам. Яшчэ падчас вучобы ў педагагічным універсітэце імя Максіма Танка па спецыяльнасці «Фізіка. Матэматыка» актыўна займалася спортам, па заканчэнні ВНУ мела званне майстра спорту па гэтым відзе баявога ўсходняга адзінаборства. Цяпер Вольга навучае яму студэнтаў у спарткомплексе БДУІР. Яна адзіная ў Беларусі жанчына, што мае пяты дан (японскі разрад у баявых мастацтвах), з'яўляецца афіцыйным прадстаўніком школы Стывена Сігала ў Беларусі, майстрам спорту міжнароднага класа па айкідо. Для «Чырвонкі. Чырвонай змены» трэнер расказала, ці можна за кароткі прамежак часу зрабіць з вучня прафесіянала, якую ролю адыгрывае духоўны аспект у адзінаборстве і як не пераносіць баявы настрой са спартыўнай залы ў паўсядзённасць.**

**— Звязаць сваё жыццё з айкідо — мэтанакіраванае рашэнне або выпадковы збег акалічнасцяў?**

— Падчас вучобы ў родным Бабруйску мяне захаплялі фільмы з удзелам вядомых акцёраў Стывена Сігала і Джэкі Чана. Тады, у 15 гадоў, я і захацела займацца баявымі адзінаборствамі, напрыклад, каратэ, але такога кірунку не знайшлося. Так я выбрала айкідо. Дзякуючы маёй упартасці трэнер узяў да сябе ў каманду, хоць па ўзросце я не падыходзіла. З тых часоў гэтае адзінаборства — частка майго жыцця.

**— Калі вы сталі трэнерам?**

— У 1999 годзе пры падтрымцы загадчыка кафедры фізічнага выхавання і спорту БДУІР Мікалая Пятрова айкідо ўвялі ў праграму навучання студэнтаў ВНУ, гэта было нешта новае нават для сталіцы. Разам з ім мы распрацавалі праграму, па якой такім кірункам баявога мастацтва маглі займацца студэнты з першага па чацвёрты курс. З таго ж года я пачала выкладаць айкідо ў БДУІР, і працягваю гэта рабіць дагэтуль.

**— Вы займаецеся толькі са студэнтамі?**

— З імі лёгка працаваць, бо яны разумеюць, якія задачы перад імі стаўлю і чаго ад іх чакаю. Штогод да мяне прыходзіць больш за сотню студэнтаў, сёлета — каля двухсот. Трэніроўкі праходзяць два разы на тыдзень, але прыемна, калі некаторыя наведваюць іх часцей. Дарэчы, я не адразу магу заўважыць перспектыўнага вучня, для гэтага трэба пачакаць некалькі месяцаў. Дзякуючы ўпартасці любы можа дасягнуць добрых вынікаў у гэтым кірунку баявога мастацтва. Напрыклад, чацвёртакурсніца Дар'я Максімава, студэнтка інжынерна-эканамічнага факультэта БДУІР, і магістрант Захар Паштальёнаў прыйшлі ў айкідо не дзеля перамог, але ўжо цяпер маюць чорныя паясы і не збіраюцца спыняцца на дасягнутым.

Сваіх сыноў аднойчы я таксама прывяла на заняткі, спрабавала прывіць ім любоў да гэтага віду баявога мастацтва, але не выйшла — старэйшы пайшоў у дзюдо, а малодшаму прыйшлося даспадобы плаванне.

**— Які ўзрост можна лічыць найбольш прыдатным для пачатку заняткаў?**

— Пэўнага, з якога рэкамендуецца ісці ў айкідо, няма. Але я б звярнула ўвагу на тое, што дзеці чатырох-васьмі гадоў яшчэ шмат чаго не разумеюць. Яны могуць зрабіць балюча адно аднаму ў адплату і атрымаць траўмы або спалохацца, калі стане балюча. Акрамя таго, маленькія вучні не ўсведамляюць духоўны аспект элементаў, а гэта вельмі важна. Таму я б раіла бацькам аддаваць дзіця на трэніроўкі з дзесяці гадоў.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Паралелі

# ЦІ МОЖА ЦТ СТАЦЬ «ГРАДУСНІКАМ» ДЛЯ ШКОЛЫ?

## У які бок павінна рушыцца незалежная ацэнка ведаў?

**А ці чулі вы, што на Адзіным дзяржаўным экзамене (АДЭ) у Расіі збіраюцца дазволіць школьнікам шукаць інфармацыю ў інтэрнэце? Праўда, размова ідзе толькі пра гуманітарныя прадметы. Адзіны дзяржаўны экзамен таксама плануецца перавесці ў электронную форму, што дазволіць персаніфікаваць заданні для вучняў і зробіць магчымай аўтаматычную генерацыю індывідуальных варыянтаў кантрольных матэрыялаў для кожнага ўдзельніка іспыту... Пры пераходзе на камп'ютарную форму абітурыенты змогуць звяртацца да розных мультымедыйных крыніц і даведачных матэрыялаў, напрыклад, працаваць з геаінфармацыйнымі сістэмамі ў геаграфіі.**

**Лічбавізацыя зробіць магчымым увядзенне відэафрагментаў у экзамен па прыродазнаўча-навуковых дысцыплінах, дазволіць ствараць заданні, дзе трэба будзе распазнаць фізічныя, хімічныя або біялагічныя працэсы ў рэальным жыцці.**

**Акрамя таго, у Адзіным дзяржаўным экзамене можа з'явіцца эксперыментальная частка, будуць паступова з'яўляцца заданні, у якіх трэба правесці эксперымент пры дапамозе прапанаванай інтэрактыўнай мадэлі, заданні з камп'ютарным эксперыментам. Разглядаецца таксама магчымасць унясення ў кантрольна-вымяральныя матэрыялы АДЭ заданняў на крэатыўнасць.**



ЦТ у нашай краіне выкарыстоўваецца выключна для адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Пазнаёміцца з прафесіяй

# З ЛЮБОЎЮ ДА ГАДАВАНЦАЎ,

## ці Галоўныя лекі ад «Айбалітаў»

**...Заходжу ў адну са сталічных ветклінік і адразу адчуваю ўтульнасць і спакой. На гадзінніку 10 раніцы, урачы рыхтуюцца да пачатку рабочага дня. Пераапранаюцца ў службовае адзенне, расстаўляюць патрэбныя колбачкі па сваіх месцах, праветрываюць памяшканне. Я тым часам падыходжу да Паўла ЗАЙЦАВА — ветэрынарнага ўрача-хірурга. Ён пагадзіўся на інтэрв'ю, каб расказаць пра асаблівасці сваёй работы.**



— Ветэрынарным урачом працую пяць гадоў. Адвучыўся ў Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, пасля на год забралі ў армію. Па заканчэнні службы ўладкаваўся ў сталічную ветклініку, працаваў асістэнтам тэрапеўта, хірурга, затым у стацыянары і рэанімацыі — лячыў жывёл з цяжкімі захворваннямі. Цяпер акрамя хірургіі праводжу і тэрапеўтычныя прыёмы, аказваю дапамогу на пачатковым этапе хваробы. Як бачыце, хірургія — не адзіная вобласць маёй прафесійнай дзейнасці, мне падабаецца вучыцца, удасканальваць свае веды і прымяняць іх на практыцы.

**— Чаму паміж «лячыць жывёл» і «лячыць людзей» вы выбралі першае?**

— Мой бацька, дзед, сястра і жонка — ветэрынары. Думаю, зразумела, чаму я хацеў навучыцца менавіта гэтай прафесіі. Зараз модна выбіраць вузкую сферу ў медыцыне, каб пазбегнуць вялікіх аб'ёмаў работы і лепш канцэнтравацца на пастаўленай задачы. Я ж лічу, што ў пачатку прафесійнай дзейнасці не трэба баяцца брацца за любы занятак у ветклініцы, каб атрымаць вопыт і развіць свае навыкі. Я так і рабіў, і цяпер магу аказаць дапамогу як буйным, так і дробным жывёлам.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
8 08 2019 г.

# ЦІ МОЖА ЦТ СТАЦЬ «ГРАДУСНІКАМ» ДЛЯ ШКОЛЫ?

### З ЭКЗАМЕНУ Ў ТУРМУ?

Трэба заўважыць, што выніковыя і ўступныя іспыты ў розных сістэмах адукацыі істотна адрозніваюцца. У большасці краін свету практыкуецца толькі пісьмовая форма, але дзе-нідзе прадугледжваюцца і вусныя адказы экзаменатарам. Толькі пісьмовыя экзамены праводзяцца ў Японіі, Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы і Сінгапуры. Адказваць вусна можна ў Германіі, Канадзе, Францыі, Італіі, краінах Скандынавіі і ў Аўстрыі. А, напрыклад, швейцарскія школьнікі могуць разлічваць на вусны экзамен у выпадку правалу на пісьмовым.

У многіх краінах свету выпускнікі здаюць экзамены толькі адзін раз: іх вынікі можна выкарыстоўваць і як выніковую атэстацыю за школу, і пры паступленні ў ВНУ. Шмат дзе працэдура здачы экзамену цалкам цэнтралізаваная. Іспыты праводзяцца ва ўсіх рэгіёнах краіны аднachасова па адзіных экзаменацыйных матэрыялах.

Вельмі сур'ёзна ставяцца да агульнадзяржаўнага экзамену — «гаакаа» — у Кітаі. Традыцыйна ён праходзіць ва ўсіх кітайскіх школах у адзін час. Школьнікам можна ўзяць з сабой толькі ручку, аловак, гумку, лінейку і цыркуль. Нават пітную ваду ў бутэльках праносіць не дазваляецца. У экзаменацыйных памяшканнях знаходзяцца дэтэктары, камеры і глушыльнікі мабільных сігналаў. За экзаменамі не могуць назіраць настаўнікі, якія вучылі гэтых дзяцей — іх замяняюць старонніх людзі. Іспыты займаюць два дні. Раніцай першага 2,5 гадзіны адводзіцца на адказы на пытанні па літаратуры і кітайскай мове, а пасля абеду — па замежнай мове і матэматыцы. У другі дзень здаецца яшчэ адзін з абавязковых прадметаў, а таксама адзін з прадметаў на выбар, які залежыць ад выбранай вучнем ВНУ. Вынікі разлічвае камп'ютарная праграма — гэта робіцца для выключэння чалавечага фактару. А за спісванне на экзамене можна трапіць у турму...

У Германіі дзяцей даволі рана размяркоўваюць па розных тыпах школ у залежнасці ад здольнасцяў. Пасля пачатковай школы можна пайсці ў Hauptschule (школу, у якой навучаюць слабых вучняў), Realschule (гэта адукацыя больш высокага ўзроўню, якая дазваляе затым перайсці ў гімназію) або адразу ў гімназію (паступіць ва ўніверсітэт можна толькі пасля заканчэння такой навучальнай установы). Варта адзначыць, што толькі чвэрць нямецкіх школьнікаў вучацца ў гімназіях і затым становяцца абітурыентамі ВНУ.

Калі гімназісты завяршаюць вучобу, яны здаюць Abitur — фінальны экзамен (ад яго назвы паходзіць слова «абітурыент»). Для гэтага выбіраюць чатыры-пяць прадметаў з трох розных галін: мовы і літаратура, сацыяльныя навукі, матэматыка і прыродазнаўчыя навукі або спорт. Як мінімум адзін з экзаменаў праходзіць у вуснай форме. Цэнтралізавана гэтыя экзамены праводзяцца толькі ў шасці нямецкіх землях з 16. Калі ўсе выпрабаванні пройдзены паспяхова, выпускнік атрымлівае атэстат, які дазваляе паступіць ва ўніверсітэт. Звычайна вынікаў Abitur дастаткова для падачы заявы, аднак некаторыя ВНУ ўсё ж практыкуюць дадатковыя экзамены.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Перад кожным цэнтралізаваным тэсціраваннем беларускім абітурыентам нагадваюць, чаго катэгарычна нельга рабіць падчас экзамену...

### А НАПІШЫЦЕ НАМ ЭСЭ...

У Францыі для паступлення ў ВНУ неабходна завяршыць навучанне ў акадэмічным ліцэі і атрымаць дыплом бакалаўра. Выпускнікі здаюць тут так званы bac (скарачэнне ад слова «бакалаўрыят»). Школьнікі павінны выбраць адзін з трох кірункаў (навуковы, літаратурны або сацыяльна-эканамічны) і здаваць пэўны набор прадметаў. Амаль на ўсіх гуманітарных іспытах ёсць эсэ. А вось пры здачы матэматыкі і прыродазнаўчых навук спатрэбіцца рашаць задачы і адказваць на пытанні з варыянтамі адказу. Зрэшты, і ў іх ёсць свая спецыфіка: скажам, на экзамене па фізіцы можна сустрэць заданні, якія патрабуюць разважанняў, а не пошукаў адзінага правільнага рашэння.

Цікава, што балы, атрыманыя на іспытах, не вырашаюць лёс выпускнікоў, бо ў французскіх універсітэтах, за рэдкім выключэннем, няма конкурсу для грамадзян краіны. Калі абітурыент паспяхова скончыў школу, ён можа проста запісацца ў выбраную ВНУ. Але найбольш прэстыжныя французскія ўніверсітэты і некаторыя факультэты звычайных ВНУ патрабуюць здачы дадатковых экзаменаў Concours.

Для паступлення ў ВНУ Ізраіля вучні здаюць псіхаметрычны экзамен, вынікі якога лічацца сапраўднымі яшчэ сем гадоў! Прымаць у ім удзел можна колькі заўгодна разоў, але паміж спробамі яго здаць павінна прайсці не менш за паўгода. Экзамен уяўляе сабой тэсты па трох кірунках: вербальнае мысленне, колькаснае мысленне (ацэньваюцца матэматычныя здольнасці) і англійская мова. На пытанні прапануюцца чатыры варыянты адказаў. Практыка паказала, што псіхаметрычны экзамен апраўдаў сябе: у большасці выпадкаў абітурыенты, якія атрымалі высокую ацэнку, дасягаюць лепшых поспехаў у вучобе, чым тыя, хто атрымаў нізкую. Аднак такі тып экзамену часта падвяргаецца крытыцы. Ёсць меркаванне, што ён дыскрымінуе людзей з пэўным тыпам мыслення, адрозным ад тыпу мыслення складальнікаў экзамену. Вынікі экзамену перадаюцца Інстытутам тэстаў абітурыенту і ва ўсе ВНУ, у якія ён звярнуўся з заявай аб прыёме.

У Японіі для паступлення ў ВНУ выпускнік павінен прайсці два туры выпрабаванняў. Першы — (University Entrance Center Examination, UECE) — цэнтралізаваны, здаецца амаль за паўгода да паступлення ў ВНУ. Гэтыя экзамены абавязковыя пры паступленні ва ўсе дзяржаўныя ВНУ. Яны ўяўляюць сабой тэсціраванне і праводзяцца па 12 прадметах. Колькасць экзаменаў вызначаецца патрабаваннямі абранай ВНУ. Другі тур экзаменаў праводзіцца ўніверсітэтамі. Яны больш складаныя за нацыянальныя і распрацоўваюцца спецыялістамі ВНУ.

Адна з самых складаных сістэм адбору выпускнікоў школ у каледжы і ўніверсітэты — у ЗША. Там няма адзіных праграм навучання і нацыянальных экзаменаў. Адзіным вымяральнікам зместу адукацыі выпускнікоў старшай сярэдняй школы з'яўляецца колькасць вывучаных курсаў, арыентаваных на падрыхтоўку ва ўніверсітэт. Самыя вядомыя і распаўсюджаныя іспыты ў ЗША, якія могуць улічвацца пры паступленні ў ВНУ, — гэта тэсты SAT (Scholastic Achievement Test) і ACT (American College Testing).

У большасці краін на іспытах прымяняюцца розныя формы праверкі ведаў: заданні з выбарам адказу, з кароткім адказам (запаўненнем формы) і з разгорнутым адказам. У еўрапейскіх краінах пераважна выкарыстоўваюцца апошнія дзве формы. Толькі ў ЗША заданні з выбарам адказу складаюць больш за палову экзаменацыйнай работы.

### ПРАЦЯГВАЕМ УГАДВАЦЬ

У цэнтралізаванага тэсціравання ў Беларусі ёсць свая адметнасць — у нашай краіне яно выкарыстоўваецца выключна для адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет. І да апошняга часу ЦТ пазіцыянавалася менавіта як абітурыенцкае, асноўныя мэты якога — ацаніць адрозненні ва ўзроўні падрыхтоўкі абітурыента, параўнаць яго індывідуальныя вынікі з вынікамі іншых удзельнікаў і вызначыць адносную пазіцыю ў групе тых, хто трымае іспыт. Вынікі такіх экзаменаў дазвалялі вызначыць рэйтынг кожнага абітурыента ў адпаведнасці з узроўнем яго падрыхтоўкі.

Але з 2019 года была ўведзена новая методыка падліку балаў на ЦТ, пры гэтым нічога ў змесце тэстаў не змянілася. Па-ранейшаму ў іх пераважаюць заданні з варыянтамі адказаў, а таму абітурыенты працягваюць угадваць правільны. Аднак калі раней нельга было метадам выпадковага выбару адказаў набраць мінімальны прахадны бал, то сёлета гэта стала магчыма, і мінімальны парог аказаўся пустой фармальнасцю. На Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў (РІКВ) абрынуўся магутны шквал крытыкі. Прычым пра тое, што абітурыенты і педагогі не разумеюць, адкуль бяруцца высокія балы пры вельмі сціплых ведах, і маю для тых, хто прэтэндуе на максімум, любая памылка каштуе цяпер вельмі дорага, казалі пасля кожнага раўнда рэпетыцыйнага тэсціравання. Пасля ЦТ ва ўсіх засталіся тыя ж пытанні.

— Сёння многія спрабуюць супрацьпаставіць добра падрыхтаваных і менш падрыхтаваных абітурыентаў, — тлумачыў журналістам **дырэктар РІКВ Юрый МІКСЮК.** — Але мы насамрэч справядліва ацанілі іх веды: цяпер 20 тэставых балаў адпавядаюць школьнай «двойцы», 30 — «тройцы» і 40 — «чацвёрцы». А рэйтынгавая методыка не дазваляла супаставіць узровень ведаў, прадэманстраваных абітурыентам на ЦТ, з яго школьнымі ведамі і адзнакамі.

Нельга сказаць, што існуе лінейная залежнасць і на «дзясятку» трэба ведаць удвая больш, чым на «пяцёрку», хоць, канешне, трэба ведаць значна больш. Новая методыка не аднімае балы, яна іх налічвае, і абітурыент, які атрымаў больш пярвічных балаў, абавязкова атрымае і большы тэставы бал. Калі ранейшая методыка ранжыравала абітурыентаў, а веды, якія дэманстравала большасць удзельнікаў экзамену, абясцэньваліся, балы за іх налічваліся мінімальныя, то новая методыка ацэньвае веды ў абсалютнай велічыні. Тут дзейнічае іншая логіка: абітурыентам трэба рашаць не супраць усіх, а паказваць максімальную паўнату ведаў. За выкананыя заданні, нават калі іх адолеюць усе ўдзельнікі ЦТ, балы не аднімаюцца. Ніхто не можа атрымаць менш за першасны бал. Методыка скіравана на тое, каб ацаніць паўнату ведаў: чым больш заданняў выконвае абітурыент, тым больш балаў ён набірае.

Юрый Міксюк не абвяргае, што праблема ўгадвання існуе, але яны зараз працуюць над тым, каб звесці яе да мінімуму. Напрыклад, тэставыя заданні па некаторых прадметах утрымліваюць не пяць дыстрактараў, а чатыры. Пры ўвядзенні пятага дыстрактара верагоднасць угадвання рэзка змяншыцца.

> **Даведка**
>
> **Тэсты PISA змяшчаюць тры асноўныя блокі: заданні на чытацкую адукаванасць (разуменне тэкстаў), матэматычную і прыродазнаўчанавуковую. У іх шмат тэкстаў, якія трэба ўважліва прачытаць (а для сучасных школьнікаў, якія не любяць вялікія тэксты, гэта, бадай што, самае складанае) і адказаць на шматлікія пытанні. Яны ідуць групамі, з прывязкай да канкрэтнага тэксту.**

Цікава, што працэнт абітурыентаў, якія набралі на ЦТ 70—75 балаў і больш, застаўся сёлета на ўзроўні мінулага года, а вось сярэднія балы ўдзельнікаў ЦТ выраслі па розных дысцыплінах прыкладна на 20 пунктаў. Парадолець 50-бальную планку — цяпер не праблема...

У снежні гэтага года стануць вядомыя вынікі PISA-2018. Гэта адно з самых аўтарытэтных даследаванняў якасці адукацыі ў свеце, якое заклікана даць адказ на пытанне: ці выконвае адукацыя сваю асноўную функцыю — падрыхтоўкі да самастойнага жыцця? Падчас яго правяраюцца не столькі акадэмічныя дасягненні навучэнцаў, колькі іх уменне прымяняць з інфармацыяй і рэальныя жыццёвыя кампетэнцыі, здольнасць вучняў устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі, іх уменне супастаўляць факты і аналізаваць, хутка прымаць рашэнні. Беларускія школьнікі ўдзельнічалі ў міжнародным даследаванні ўпершыню, у адрозненне ад сваіх украінскіх ці расійскіх равеснікаў.

А тым часам галоўны куратар PISA Андрэас Шляйхер заявіў, што ўкараненне ў Расіі Адзінага дзяржаўнага экзамену аказала станоўчы ўплыў на сістэму адукацыі, у прыватнасці, старшакласнікі сталі лепш спраўляцца са складанымі заданнямі, якія ідуць пасля тэставай часткі АДЭ. Пры гэтым, на яго думку, тэсты з множным выбарам варыянтаў адказаў не вельмі дарэчныя ў сучаснай сістэме адукацыі. Аптымальным варыянтам Шляйхер лічыць заданні, у якіх навучэнцам трэба даваць экзаменатарам больш складаныя і разгорнутыя адказы. А беларусам застаецца толькі дачакацца вынікаў PISA, каб зразумець, наколькі нашы 15-гадовыя падлеткі канкурэнтаздольныя, як і наша сістэма адукацыі?

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Вельмі сур'ёзна ставяцца да агульнадзяржаўнага экзамену — «гаакаа» — у Кітаі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Свой досвед

# «Падпрацоўваць становіцца нават модна»

## Будучы выкладчык — аб рабоце ў дзіцячым лагеры і не толькі

**Пачаць зарабляць самастойна — адно з найважнейшых рашэнняў, з неабходнасцю прыняцця якога маладыя людзі абавязкова сутыкаюцца на пэўным этапе свайго жыцця. Зараз для юнакоў і дзяўчат ёсць шырокі выбар магчымасцяў як для летняй падпрацоўкі, так і для работы на пастаяннай аснове. Канешне, усё залежыць ад індывідуальных здольнасцяў і талентаў саіскальніка, яго зацікаўленасці ў той ці іншай сферы дзейнасці. Калі ў вас ёсць жаданне выбраць шлях да фінансавай незалежнасці, давайце пазнаёмімся з вопытам работы ў дзіцячым лагеры студэнткі трэцяга курса лінгвагуманітарнага каледжа МДЛУ Лізаветы КЕМЕН.**



Лізавета (крайняя справа) з выхаванцамі.

***— Што было галоўным штуршком у гэтым тваім рашэнні?***

— Раней я раздавала рэкламныя лістоўкі, шчыравала ў кол-цэнтры, таму магу сказаць, што знаходзіць падпрацоўку ў пазавучэбны час для мяне было не ў навінку. Сёлета задача па яе пошуку ў разы стала лягчэйшай у сувязі з тым, што наш каледж дае для студэнтаў трэцяга курса магчымасць на летні час праходзіць практыку, якая аплачваецца, у аздараўленчых лагерах па ўсёй краіне. Я была рада такой магчымасці, бо з самага дзяцінства ездзіла ў іх на канікулах і, калі назірала за дзейнасцю выхавальнікаў-важатых атрадаў, заўсёды хацела сама апынуцца на іх месцы. Гэта выдатны і цікавы вопыт, тым больш, яшчэ і ніядрэнны заробак. Хоць кіраўніцтва каледжа прапаноўвала нам шэраг лагераў, з якіх мы маглі выбіраць, вырашыла самастойна знайсці адпаведнае для сябе месца. Праштудзіравала водгукі ў інтэрнэце, у прыватнасці, даведалася меркаванне дзяцей, знайшла варыянт, патэлефанавала туды і — дамовілася на гутарку...

***— Ці наведвала спецыяльныя майстар-класы, семінары або вэбінары, каб неяк падрыхтавацца да паездкі?***

— Я вучуся на выкладчыка англійскай мовы і мая будучая прафесія мае на ўвазе непасрэднае ўзаемадзеянне з дзецьмі, іх навучанне і выхаванне. У каледжы мы наведвалі майстар-класы па арганізацыі гурткоў, семінары па фізічнай падрыхтоўцы, прыдумлялі гульні для дзяцей, назвы атрадаў, дэвізы, малявалі плакаты і рабілі многія іншыя цікавыя рэчы. А за два дні да прыезду дзяцей падрыхтоўвалі карпусы і праходзілі розныя семінары ўжо непасрэдна ў самім лагеры.

***— Што найперш патрэбна, каб працаваць выхавальнікам-важатым?***

— Безумоўна, ён павінен валодаць пэўным наборам якасцяў. Гэта і камунікабельнасць — уменне выбудоўваць стасункі і знаходзіць агульную мову з дзецьмі, і арганізатарскія здольнасці, і творчы падыход да працы, і крэатыўнасць, і стрэсаўстойлівасць. А яшчэ спагадлівасць і адказнасць, што асабліва важна, калі вы працуеце з дзецьмі, гатоўнасць праяўляць не толькі творчую, але і фізічную актыўнасць. Я лічу, што валодаю многімі якасцямі з гэтага спіса.

***— Ці ўзнікалі складанасці падчас знаходжання ў лагеры?***

— Былі, але не крытычныя. Трэба браць пад увагу, што ўсе дзеці — розныя, да кожнага патрэбны індывідуальны падыход. У нас у атрадзе сабралася 50 хлопчыкаў і дзяўчынак ва ўзросце ад 9 да 12 гадоў. Першыя тры дні былі самыя цяжкія: трэба было пазнаёміцца з кожным, запомніць усіх па імёнах, пастарацца даведацца пра іх псіхафізіялагічныя асаблівасці... Складаней за ўсё было адаптавацца дзецям, якія ўпершыню прыехалі ў лагер. Яны сумавалі па бацьках, часам плакалі, а мы, у сваю чаргу, павінны былі прыкласці ўсе намаганні, каб стварыць спрыяльную атмасферу і даць ім магчымасць хутчэй прывыкнуць да новага месца. Узнікалі некаторыя цяжкасці ў падрыхтоўцы да розных конкурсаў, але мы справіліся. Наш атрад заняў першае месца ў малодшай дружыне, больш за тое, на працягу ўсёй змены мы займаем толькі прызавыя месцы. І, як я лічу, гэта і ёсць паказчык таго, што мы з маленькімі выхаванцамі сталі выдатнай зладжанай і дружнай камандай.

***— А як ты ўвогуле лічыш: ці трэба маладым людзям акрамя вучобы яшчэ і падпрацоўваць?***

— Калі ёсць магчымасць, чаму б і не? Асабліва калі хлопцы і дзяўчаты, як і я, вучацца на платным і здымаюць кватэру. Грошы дакладна лішнімі не будуць. Тым больш, калі студэнт пачынае працаваць па спецыяльнасці, на якую вучыцца, то да заканчэння навучальнай установы ў яго будзе рэальны досвед у абранай сферы, адпаведна больш высокія шанцы знайсці высокааплатную работу. І калі падчас вучобы з-за падпрацоўкі можа пагоршыцца паспяховасць, то летняя прынясе толькі карысць. Цяпер можна знайсці розныя варыянты дадатковага заробку і выбраць той, які падыдзе менавіта вам. Падпрацоўваць становіцца нават модна. Таму, калі ў вас ёсць такое жаданне, то — наперад!

**Надзея БОБРЫК, студэнтка І курса факультэта міжкультурных камунікацый МДЛУ.**



У атрадзе былі дзеці ад 9 да 12 гадоў.

Новыя старты

# «У АБ'ЕКТЫВЕ СТУДАТРАД»

**Пад такой назвай БРСМ праводзіць рэспубліканскі конкурс, прысвечаны Году студэнцкіх атрадаў.**

На яго прымаюцца каляровыя і манахромныя фатаграфіі, атрыманыя аналагавым або лічбавым спосабам, зробленыя ў перыяд трэцяга працоўнага семестра 2019 года. Яны павінны ўтрымліваць сімволіку руху: шаўроны, нашыўкі, значкі, эмблемы, сцягі, студатрадаўскія курткі, майкі, газеты і дыслакацыйныя стэнды студэнцкіх атрадаў. Фотаработы прымаюцца як у арыгінальным выкананні, так і ў артапрацоўцы графічнымі рэдактарамі. Творчае спаборніцтва праводзіцца па дзесяці тэматычных тыднях.

На пачатку кожнага з іх у групе «Беларускія студэнцкія атрады» ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» публікуецца тэма, па якой прымаюцца фатаграфіі ад штабоў працоўных спраў. Конкурсная камісія іх ацэньвае і выстаўляе на ўсеагульнае галасаванне. З самых рэйтынгавых фатаграфій па выніках дзесяці конкурсных тыдняў журы вызначыць дзясятку самых цікавых работ і зноў выставіць іх на галасаванне. У выніку пераможцамі стануць як штабы працоўных спраў, якія падалі адмысловыя заяўкі, так і студатрады, што адлюстраваны на гэтых здымках.

Пераможцаў чакаюць каштоўныя падарункі. А фатаграфіі прадставяць на выстаўцы ў час злёту студатрадаў, на якім будуць падведзены вынікі працоўнага семестра гэтага года. Апроч таго, яны будуць выкарыстаны ў студатрадаўскай паліграфіі.

Конкурс будзе доўжыцца да 6 кастрычніка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ

# Трэці працоўны — трэцяй лініі метро

**Падчас адкрыцця трэцяга працоўнага семестра ў сталіцы было абвешчана, што трэцяя лінія мінскага метро стане гарадской маладзёжнай будоўляй.**



На аб'ектах унітарнага прадпрыемства «Мінскметрабуд» працуе студэнцкі будаўнічы атрад імя Героя Савецкага Саюза Георгія Сяргеевіча Тамілоўскага. У яго ўвайшлі 20 навучэнцаў філіяла БНТУ «Мінскі дзяржаўны архітэктурна-будаўнічы каледж». Працоўныя будні байцы будаўнічага атрада прысвячаюць пагрузцы, выгрузцы і транспарціроўцы будаўнічых матэрыялаў, ачыстцы скальных аснаванняў, сартаванню запчастак пры разборцы інструмента і іншым відам работ.

У пачатку жніўня да працы на Мінскай гарадской маладзёжнай будоўлі далучыўся студэнцкі будаўнічы атрад «Адраджэнне» з Санкт-Пецярбурга.

# Паступіў сам — дапамажы іншым

**Сёлета Мінскім гарадскім штабам студэнцкіх атрадаў было сфарміравана 15 сэрвісных атрадаў «Штаб Абітурыент», у рамках якіх працаўладкавана больш як 150 юнакоў і дзяўчат.**

Асноўным функцыяналам для іх стала дапамога абітурыентам у запаўненні дакументаў для паступлення ў ВНУ, кансультацыя па вучэбных пытаннях, а таксама садзейнічанне ў арганізацыі ўступных экзаменаў для абітурыентаў, якія паступаюць на скарочаную форму навучання.

Напрыклад, студэнцкі сэрвісны атрад Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта «Штаб Абітурыент» імя Героя Савецкага Саюза Іосіфа Гусакоўскага ў колькасці 12 чалавек працаваў з 10 ліпеня да 4 жніўня. За гэты час было прынята больш за дзве тысячы заяў.

Камандны дух

# Маладыя лідары жніва

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі даў старт рэспубліканскаму праекту «Моладзь — за ўраджай!»**

Традыцыйна ён праводзіцца ва ўсіх рэгіёнах краіны ў перыяд уборачнай кампаніі. Спаборніцтвы арганізуюцца сярод маладзёжных экіпажаў камбайнаў і маладых кіроўцаў, занятых на адвозцы збожжавых і зернебабовых культур. Пры кожным тэрытарыяльным камітэце БРСМ ствараюцца штабы, якія займаюцца пытаннямі, звязанымі з праектам і ўдзелам моладзі ва ўборачнай кампаніі.

Спаборніцтвы пройдуць у намінацыях «Маладзёжны экіпаж камбайнераў, які дасягнуў найбольшага намалоту» і «Малады кіроўца, што перавёз найбольшую колькасць збожжа». Пераможцамі стануць першыя экіпажы-тысячнікі і кіроўцы, якія занялі прызавыя месцы па выніках уборачнай кампаніі.

Тэхніку, на якой працуе моладзь, пазначаюць адмысловымі налепкамі «Маладзёжны экіпаж» і «Малады кіроўца». Ушанаванні лідараў з уручэннем пераможцам дыпломаў і вымпелаў праходзяць на палях. А іх бацькам накіроўваюць падзячныя лісты... Пераможцаў спаборніцтваў у кастрычніку запросяць на рэспубліканскі форум сельскай моладзі, дзе ўручаць каштоўныя падарункі.

Сачыць за ходам рэспубліканскага праекта «Моладзь — за ўраджай!» можна на афіцыйных інтэрнэт-рэсурсах БРСМ, а таксама ў групах маладзёжнай арганізацыі ў сацыяльных сетках пад хэштэгамі #молодежьзаурожай, #жатвабеларуси2019, #малаяродина.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
8 08 2019 г.

Камертон настрою

# Маленькая «зорачка» Даша

**Леанарда да Вінчы быў не толькі геніяльным мастаком, але і навукоўцам, вынаходнікам, пісьменнікам і музыкам. Уладзімір Набокаў — літаратарам, шахматыстам і энтамолагам-самавучкам. Гётэ — паэтам, калекцыянерам... Існуе такая прымаўка: «Таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім». Ці сапраўды гэта так? Адказ прыйшоў, калі я пазнаёмілася з адоранай 10-гадовай дзяўчынкай.**

Дар'я Вархола не проста прыгожая сабой, яна яшчэ скарае ўпэўненасцю ва ўласных сілах. Жыве дзяўчынка ў Гродне і скончыла сёлета чацвёрты клас у гімназіі № 4. З аднакласнікамі Даша мае добрыя стасункі, бо бацькі заўсёды вучылі імкнуцца ні з кім не сварыцца і нікога не крыўдзіць. Вядома, як і ва ўсякага таленавітага чалавека, у дзяўчынкі таксама былі канфліктныя сітуацыі. Аднак яна старалася заўсёды вырашаць іх спакойна. Даша стала ўлюбёнкай настаўнікаў, таму што заўсёды грунтоўна рыхтуецца да ўрокаў, а ў яе дзённіку можна ўбачыць толькі «9» і «10».



Нягледзячы на выдатную вучобу ў гімназіі, у Дашы ёсць шмат іншых захапленняў. Дзяўчынка ніколі не сядзіць на месцы, кожны яе дзень распісаны па хвілінах. Упершыню на публіку яна выйшла яшчэ ў дзіцячым садзе. Пазней паспрабавала свае сілы ў спевах і запісалася на вакал. Спадабалася. І Даша пайшла далей.

Пасля некалькіх невялікіх паспяхова пройдзеных творчых спаборніцтваў вырашыла стаць удзельніцай І міжнароднага музычнага конкурсу маладых выканаўцаў «АРС НОВА-2016», які праходзіў у Мінску. Удача была на Дашыным баку і дадому яна вярнулася з кубкам. На гэтым не спынілася і працягвала далей удзельнічаць у розных музычных праектах. Дзяўчынка атрымала гран-пры 1-га адкрытага конкурсу выканаўцаў-пачаткоўцаў «Мы — таленты твае, Беларусь!» Самымі запамінальнымі былі «Зорныя кветкі», якія праходзілі ў сталіцы. Там сабраліся ўдзельнікі не толькі з Беларусі, але яшчэ з 14 краін, было мора ўражанняў і шмат цікавых знаёмстваў.

Актыўныя выступленні прынеслі дзяўчынцы яшчэ і прыемныя сустрэчы з такімі папулярнымі людзьмі, як Валерый Дайнека, Вадзім Галыгін, Дзядзька Ваня, Ігар Багамазаў (экс-саліст «Адпетых махляроў»). А расійскі спявак Сяргей Крылоў нават пакінуў ёй на памяць сваю шапку.

Акрамя вакалу Даша таксама займаецца ў тэатральнай студыі «Званочкі», дзе навучаецца акцёрскаму майстэрству і сцэнічнай мове, іграе ў розных спектаклях. Дома ў Дашы таксама хапае клопатаў, бо трэба пашыць адзенне для цацак і лялек, дапамагчы маме па гаспадарцы. Даша лепіць мініяцюры з палімернай гліны. Мае сіні пояс па каратэ, праўда, адзінаборствамі яна перастала займацца, бо на ўсё не хапала часу. Зараз Даша з нецярпеннем чакае пераходу ў пяты клас, бо тады яна будзе вучыцца ў першую змену і ў яе зноў з'явіцца магчымасць займацца каратэ.



— Мне падабаецца тое, чым я займаюся, — падзялілася са мной Даша. — Часам бывае цяжка справіцца з усімі заняткамі, затое заўсёды ведаю, што атрымаю за сваю працу галоўную ўзнагароду — удзячных гледачоў.

Ва ўсіх пачынаннях Дашу заўсёды падтрымліваюць бацькі: тата займаецца арганізацыйнымі пытаннямі, падвозіць на рэпетыцыі, а мама шые ўборы для выступленняў. Сама дзяўчынка пакуль не вызначылася, кім сябе бачыць у будучыні, затое дакладна ведае: са сваімі захапленнямі яна ніколі не расстанецца.

**Ілона ПАПОВА,**
**студэнтка III курса**
**філалагічнага факультэта**
**БрДУ імя А. С. Пушкіна.**

# З ЛЮБОЎЮ ДА ГАДАВАНЦАЎ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

***— Ці заўсёды вы разумееце братоў нашых меншых, можаце вызначыць, што ў іх баліць?***

— Прычына захворвання становіцца зразумелая пасля агляду або ультрагукавога даследавання. Напрыклад, каты часта любяць глытаць бонсцікаў. Прыводзяць да мяне на прыём пушыстага сябра, кажуць, што дзеці ў сям'і любяць збіраць дробныя цацкі. Адразу разумею, у чым справа. Раней у мяне нават калекцыя такіх рэчаў была, якая часта папаўнялася. Але часам бываюць складаныя выпадкі. Асабліва калі гаспадары нешта недагаворваюць. А мы ж не экстрасэнсы, а ўрачы, і павінны ведаць усё пра тых, каго лечым.

Аднойчы сям'я прывяла сабаку. Сказалі, што ён раскусіў цюбік з клеем, і цяпер у яго пастаянна цячэ сліна. Вялікі акіта-ін (японская парода) не даваў сябе агледзець, быў неспакойны. Я нічога асаблівага не знайшоў, але калі падняў сабаку язык, убачыў маленькія ранкі. Аказалася, жывёла праглынула клубок нітак, якія пераціснулі яму язык — гадаванцу было балюча есці. Пасля знаходкі гаспадары ўсё ж прызналіся, што нявестка дома любіць шыць, а дапытлівы сабака мог падабраць яе прылады працы. Гэта толькі адзін прыклад, які доказвае: лепш паведаміць урачу як мага больш інфармацыі.

***— Па вашых назіраннях, якія захворванні найбольш распаўсюджаныя сярод жывёл?***

— У кожнай пароды ёсць свае асаблівасці развіцця, фарміравання арганізма, а, значыць, свае генетычныя схільнасці да хвароб. Напрыклад, у катоў-брытанцаў, сфінксаў, шатландцаў і мэйн-кунаў распаўсюджаныя сардэчна-сасудзістыя захворванні, у сабак пароды ёркшырскі тэр'ер і шпіцаў слабыя каленныя суставы, а ў таксаў — апорна-рухальны апарат. Гэта я заўважаю зыходзячы з практыкі. Калі разглядаць інфекцыі, то складана сказаць, якім пародам уласцівая тая ці іншая іх разнавіднасць. Таксама, па маіх назіраннях, дваровыя сабакі і кошкі больш устойлівыя да ўзбуджальнікаў хвароб, чым пародзістыя.

***— Якія памылкі робяць гаспадары «з-за вялікай любові»?***

— Нярэдка перакормліваюць сваіх гадаванцаў, з-за чаго ў іх развіваецца атлусценне. Ці бывае, што даюць няякасны корм. Важна ведаць, што да года ў жывёл фарміруецца арганізм, і ад таго, чым вы станеце іх карміць, будзе залежаць далейшае здароўе. Нельга даваць маленькаму кацяняці толькі мяса і малако — ёсць вялікая верагоднасць, што ў наступным косці стануць ломкія. Тое ж самае датычыцца і вітамінаў, з якімі «гранашаць» гаспадары — добрая ежа прынясе больш карысці, чым хімічныя дадаткі.

***— Што трэба, каб заставацца прафесіяналам сваёй справы?***

— Без штодзённай практыкі набытыя навыкі хутка губляюцца. Я перыядычна выязджаю ў суседнія краіны на розныя семінары. Нядаўна быў у Санкт-Пецярбургу на хірургічнай канферэнцыі, дзе выступалі спікеры з Бельгіі, ЗША, ЮАР. Раз у месяц разам з іншымі ўрачамі нашай клінікі наведваем лекцыі ў Мінску і ў Маскве.

Пакуль мы абмяркоўвалі гэтыя тэмы, да Паўла на прыём прыйшоў новы пацыент. Я тым часам звярнулася да напарніка нашага суразмоўніка — маладога ветурача-анестэзіёлага Уладзіміра ФЕДАСЕЕНКІ. У гэтай клініцы ён працуе з мінулага года — са дня яе адкрыцця.

— Для таго каб стаць класным ветурачом, трэба быць не толькі начытаным і працавітым, але яшчэ і добрым, схіляць да сябе і людзей, і жывёл. Бо першапачаткова многія гаспадары хатніх гадаванцаў настроены да лекараў скептычна, з недаверам, і трэба зрабіць так, каб іх меркаванне змянілася.





Жывёлы не размаўляюць, але яны адчуваюць станоўчую ці адмоўную энергетыку таго, з кім узаемадзейнічаюць.

***— Існуе меркаванне, што ў кожнага ветурача павінна быць хоць адна свая хатняя жывёліна...***

— Сапраўды, у нашай клініцы ў кожнага супрацоўніка ёсць такая, ды не адна *(усміхаецца)*. У мяне, напрыклад, два сабакі, кошка і хамяк, у Паўла — чарапаха, кошка і марская свінка. Мы не сталі б прафесіяналамі ў гэтай сферы без любові да братоў нашых меншых! Бывае, што некаторыя кліенты прыходзяць да нас са здаровымі жывёламі і просяць усыпіць апошніх, бо яны ім надакучылі. Не разумею такога стаўлення. Нашы ўрачы па магчымасці забіраюць іх да сябе або шукаюць іншы прытулак.

А яшчэ быў выпадак, калі каля нашай клінікі пасяліліся некалькі кошак. Іх пастаянна падкормлівалі, таму яны не сыходзілі. Каб жывёлы не пладзіліся, мы іх стэрылізавалі. Аднак праз некаторы час убачылі маленькіх кацянят. Аказалася, што каля запраўкі, якая знаходзілася побач, пасялілася яшчэ адна кошка. Мы і ёй дапамаглі.

...Размова з урачамі Паўлам і Уладзімірам адбылася цікавая і пазнавальная. Але ў іх было яшчэ шмат работы. Таму я больш не стала ім перашкаджаць, тым больш што іх чакаў новы пушысты пацыент...

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Кропка адліку

# ЯК СТАЦЬ ГУРУ Ў ЛІТАРАТУРЫ?

## Разважанні маладой паэтэсы

**Хто такі творца ў час імклівых тэхналогій? Чым ён жыве і чым дыхае? Для таго каб знайсці адказы на гэтыя і іншыя пытанні, мы пагутарылі з маладой беларускай аўтаркай Кацярынай МАСЭ. Сёлета яна скончыла лінгвістычны ўніверсітэт. Апроч таго, займаецца даследчыцкай дзейнасцю ў галіне лінгвістыкі і паэтыкі. Шмат малюе — апошняя кніга суразмоўніцы выйшла з яе ўласнымі ілюстрацыямі.**



**— Калі ў вас з'явіліся першыя радкі?**

— У вершаскладанне (не адразу ў паэзію, канешне) прывяла нейкая асабістая да гэтага схільнасць і дзіцячае прадчуванне, што тут ёсць нешта цікавае, хоць у мяне было вельмі шмат іншых захапленняў. Спачатку ніхто ніякага значэння гэтаму не надаваў, бо, напэўна, усе дзеці ў свой час выдумляюць нейкія вершыкі. А ў мяне ў пэўны момант — гадоў у дзесяць — узнікла неадольнае жаданне... выпусціць уласную кнігу. Як ні дзіўна, з часам мара ажыццявілася, і звычайная дзіцячая забава перарасла амаль што ў прафесію.

**— А як зараз рэагуюць на тое, што вы паэтэса?**

— У асноўным з цікавасцю, таму што гэта, мабыць, не самы распаўсюджаны занятак, і многія не зусім уяўляюць, што насамрэч стаіць за ім. Калі пачынаеш расказваць пра свае кнігі, выступленні і наогул творчую філасофію, бачна, што ў суразмоўнікаў досыць скажонае, стэрэатыпнае ўяўленне наконт такіх рэчаў. Але ўсё роўна ўсе заўжды з вялікай цікавасцю распытваюць мяне.

**«Хацелася, каб мае дзеці выхоўваліся на якасных кнігах, і — так я для сябе вырашыла — калі не знайду таго, што шукаю, напішу для іх гэтыя казкі сама».**

**— Вы пачалі пісаць на рускай мове, а потым перайшлі на беларускую...**

— Так сталася, што мяне зацягнула ў вір нейкіх мерапрыемстваў, звязаных з роднай мовай — гэта і музыка, і моўныя курсы, якія тады пачалі набіраць папулярнасць. У той час раптам выйшаў на сувязь далёкі сваяк, які даўно захапляецца беларушчынай і размаўляе на роднай мове. Я гэта ўсё называю ўдалым збегам абставін — калі ўсё складваецца так, што ты проста не можаш не звярнуць на штосьці ўвагу. Нейкі час не адважвалася пераходзіць на беларускую мову, але потым захацелася паспрабаваць, паглядзець, што ж з гэтага атрымаецца. У выніку ў пэўны момант зразумела, што не хачу зноў вяртацца да рускай.

**— Вы лінгвіст. Не думалі тварыць, напрыклад, на англійскай, французскай?**

— У мяне першая мова — нямецкая, якую я вывучаю ўжо вельмі даўно, на ёй напісала некалькі вершаў. Пакуль яны чакаюць ці то свайго часу, ці то ўдасканалення, ці то і першага, і другога. Пакуль што больш займаюся перакладамі — як з нямецкай мовы, так і на яе. Зрабіла гэта з некалькімі творамі свайго любімага нямецкага паэта Фрыдрыха Гёльдэрліна, творчы вынік быў апублікаваны ў «Маладосці». Перакладала таксама філасофскія эсэ Хайдэгера, а пасля працавала над аповесцю «Вучні ў Саісе» Navaліса. Англійскую ведаю таксама добра, але не настолькі, каб займацца літаратурнымі перакладамі.

**— У вас ёсць вершы з графічным аздабленнем...**

— Я займаюся жывапісам і графікай досыць даўно. Наведвала некалькі мастацкіх школ і студый, вывучала акадэмічны малюнак. Ідэя аформіць уласную кнігу ў мяне з'явілася даўно, але я ўсё ніяк не магла намацаць патрэбны стыль, у якім хацела б гэта зрабіць. Я чакала, нават хацела сваю папярэднюю кнігу «Двайковы код» таксама праілюстраваць, але нічога не выйшла. Тады ў мяне не было ні натхнення, ні канкрэтных ідэй, але больш за два гады таму раптам зразумела, чаго хачу. Пачала працаваць над ілюстрацыямі, займалася імі больш за год. Гэта былі як сюжэтныя вывявы ад рукі, так і распрацаваныя на камп'ютары арнаментальныя матывы. Усё потым аб'ядналa ў кнігу, і атрымалася, на мой погляд, вельмі годна.

**— Вы самакрытычны чалавек?**

— Вельмі! І гэтак жа востра рэагую на крытыку з боку іншых людзей. Яна кожны раз выбівае мяне з каляіны, мне цяжка перажыць нават дробныя заўвагі. Але часцей за ўсё бывае так, што спачатку я іх аспрэчваю сама з сабой, а потым, баючыся самой жа сабе ў гэтым прызнацца, ціхенька выношу з сітуацыі нешта карыснае. Як ні балюча ўсведамляць *(усміхаецца)*, крытыка дапамагае мне расці. Але не заўсёды: любое выказванне на свой адрас варта заўжды звяраць з тым, што табе кажа твой унутраны суддзя.

**— А ці здараюцца ў вас творчыя крызісы?**

— Вядома, у каго іх не бывае. Я да гэтага стаўлюся адэкватна. Любы здаровы крызіс — гэта крызіс росту. Калі ён надыходзіць, значыць, ты расцеш, ты развіваешся.

**— Ніколі не прымервалі на сябе ролю дзіцячай пісьменніцы?**

— Быў момант, калі мне раптам захацелася паспрабаваць пісаць казкі, бо я вельмі захапляюся фальклорам, міфалогіяй. Насамрэч добрая дзіцячая казка — гэта такая, якую можа прачытаць і дарослы, узяўшы адтуль нешта важнае для сябе. Хацелася, каб мае дзеці выхоўваліся на якасных кнігах, і — так я для сябе вырашыла — калі не знайду таго, што шукаю, напішу для іх гэтыя казкі сама.

**— Хацелі б, каб на вашы вершы стваралі песні?**

— Такое ўжо мела месца. Дарэчы, некалькі кампазіцый напісаў мой беларускамоўны сваяк, пра якога я распавядала напачатку, — Ілья Фаляжынскі. Ён музыка, выступае ў Беларусі і Польшчы. Адзін тэкст напісала спецыяльна для таго, каб пакласці яго на музыку. Два іншыя ён перапрацаваў ужо сам. Атрымалася, на мой погляд, здорава *(смяецца)*. Апроч гэтага, я шмат супрацоўнічала з рознымі музыкамі, з якімі мы разам стваралі паэтычна-музычныя праграмы. На маіх імпрэзах гучалі гітара, фартэпіяна, цымбалы. Мне хацелася б і надалей працаваць у такім рэчышчы.

**— Што вам больш даспадобы для чытання: сучасная або класічная літаратура?**

— Сучасная немагчымая без класікі, а класіка немагчымая без сучаснасці, хоць апошняе і не надта лагічна гучыць. Я аднолькава моцна люблю і першую, і другую, але далёка не ўсю. З паэтаў-класікаў для мяне асабіста найбольш важныя Вячаслаў Іванаў, Фрыдрых Гёльдэрлін, Алесь Разанаў, Максім Багдановіч, Андрэй Белы, Хуан Рамон Хіменес. З сучасных магу вылучыць Міхаіла Баярына, Ігара Кулікова, Фелікса Аксёнцава, Галіну Сіўчанка, Насту Кудасаву. Хоць гэта, зразумела, не поўны спіс.

**— Уяўляеце, як гадоў праз колькі вашы вершы будуць вывучаць у школе...**

— Ясна, што я не стала б адмаўляцца. Мяне ўжо, дарэчы, аднойчы запрашалі ў школу расказаць аб сваёй творчасці, паказаць кнігі. А адносна нядаўна двое дзяўчат удзельнічалі ў навукова-практычнай канферэнцыі з работай аб маёй творчасці, прычым спачатку на рэспубліканскім узроўні, а потым на міжнародным. Мне гэта было вельмі прыемна.

**— Што вы маглі б параіць пісьменнікам-пачаткоўцам?**

— Я думаю, што ім, перш за ўсё, трэба знайсці нейкі свой эталон у літаратуры. Гэта можа быць класіка або сучаснасць — не важна. Але знайсці ўласнага літаратурнага гуру трэба. З ім не абавязкова кантактаваць, хоць, калі атрымаецца, будзе добра. І, па-другое, я, мабыць, не раіла б адразу выходзіць у свет са сваімі творамі, таму што патрэбна, каб прайшоў час, і яны саспелі. Не самі па сабе, канешне, а ў рабоце. Спачатку трэба пасядзець, пакорпацца ва ўсім гэтым, паспрабаваць пісаць па-рознаму, павыпрабоўваць сябе. І толькі калі аўтар будзе дастаткова ўпэўнены, што тое варта камусьці паказваць, тады і трэба гэта рабіць. А магчымасцяў дзяліцца сваёй творчасцю цяпер звышдастаткова, было б жаданне.

**— Чым любіце займацца ў вольны час?**

— У мяне дагэтуль, як і ў дзяцінстве, дастаткова шырокае кола захапленняў: гэта і філасофія, і этнаграфія, і мастацтва, і музыка. Таксама вельмі люблю ўсё, што звязана з рухам, — танцы, ёгу, прагулкі на прыродзе. Пра тое, што я не магу і дня пражыць без чытання — і для работы, і для душы — і казаць не варта.

**Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка II курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

Ідэі маладых

# «Abitur» усім у дапамогу

**Якую прафесію выбраць? Куды паступаць? Як не памыліцца з будучыняй? Гэтыя пытанні, вядома, узнікаюць кожны год у выпускнікоў школ, гімназій, каледжаў і ліцэяў. І далёка не заўсёды лёгка знайсці патрэбныя адказы. З падобнай праблемай сутыкнуўся і выпускнік Маладзечанскага гандлёва-эканамічнага каледжа спецыяльнасці «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» Сяргей САВІНСКІ летась. Аднак, не разгубіўся, вырашыў знайсці патрэбную інфармацыю сам, а таксама дапамагчы іншым, стварыўшы мабільную праграму «Abitur». З ёй ён стаў адным з лідараў сёлетняга абласнога этапу конкурсу «100 ідэй для Беларусі», які ладзіцца Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі.**

— Увогуле, я распрацоўваў праграму для дыпломнай работы, — расказвае вынаходнік. — Але пасля вырашыў пайсці на рэспубліканскі фестываль-конкурс па эканоміцы і прадпрымальніцтве «Лесвіца поспеху», арганізаваны Цэнтрам падтрымкі і развіцця юнацкага прадпрымальніцтва, дзе і перамог. Вырашыў не спыняцца. На «100 ідэй для Беларусі» паклікаў на дапамогу яшчэ двух навучэнцаў каледжа — Максіма Шупляка і Аляксандра Храмцэвіча.

Для стварэння праграмы Сяргей самастойна пачаў вывучаць мову праграмавання, якую не праходзіў у каледжы, апытваў іншых абітурыентаў, якой бы яны хацелі бачыць праграму, ці карысталіся б ёй. Пасля, вядома, прагэсціраваў свой праект на фокус-групе. Усяго за два-тры месяцы хлопцу ўдалося вырашыць праблему, з якой ён сутыкнуўся пры выбары навучальнай установы.

Цяпер любы ахвотны можа праглядзець інфармацыю пра шматлікія сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы, кароткія звесткі пра факультэты, спецыяльнасці, колькасць балаў, неабходных для паступлення, кошт навучання... Для гэтага была праведзена работа па зборы даных.

— У любой навучальнай установы ёсць свой афіцыйны сайт, — тлумачыць Сяргей. — Але праблема ў тым, што не кожны добра функцыянуе, ці там не часта абнаўляюцца звесткі. Таму спачатку я шукаў інфармацыю ў даведніках у папяровым варыянце, а потым перайшоў на напісанне алгарытмаў, якія аўтаматычна бяруць патрэбнае з інтэрнэт-сайтаў.

У многіх узнікае пытанне, у чым жа перавагі «Abitur» гэтага дадатку? Усё неабходнае можна знайсці ў інтэрнэце! Але Сяргей лічыць, што яго праграма нашмат прасцейшая і больш зручная ў карыстанні. Да таго ж, яна запускаецца без інтэрнэту. І месца «Abitur» займае няшмат: не больш за тры мегабайты.

Зараз Сяргей працягвае дзейнасць у сферы ІТ, развівае свае навыкі далей: вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі, а таксама падпрацоўвае ў кампаніях, распрацоўваючы дызайн інтэрфейсаў. Займаецца ён і іншымі праектамі... Кажа, што «Abitur» для яго — добры досвед, але гэта толькі першая прыступка ў рэалізацыі сваіх магчымасцяў.

**Юлія АДАМОВІЧ.**

## Извещение о проведении 9 сентября 2019 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Банк Дабрабыт»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| изолированное помещение общей площадью 145,3 кв. м с инв. № в ЕГРНИ 500/D-1004494 (наименование: административное помещение; назначение: административное помещение) | г. Минск, ул. Максима Богдановича, д. 120 Б, пом. 5 | 352 634,90 | 35 200,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Банк Дабрабыт», ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, 220002, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Банк Дабрабыт», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся 9 сентября 2019 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 05.08.2019 по 05.09.2019 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017)327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017)239-19-26 (ОАО «Банк Дабрабыт»)

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 02.09.2019 г. повторного открытого аукциона (цена снижена на 50 %)

Лот № 1: **Капитальное строение с инв. № 700/С-49170 – Гараж**, площадью – 101,0 кв. м, назначение: здание специализированное транспорта, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000005003093 (право постоянного пользования, площадь 0,411 га, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания склада материалов) по адресу: г. Могилев, ул. Полевая, 6. **Капитальное строение с инв. № 700/С-49160 – Склад материалов**, площадью – 1024,0 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 7401000005003093 (право постоянного пользования, площадь 0,411 га, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания склада материалов) по адресу: г. Могилев, ул. Полевая, 6. **Капитальное строение с инв. №700/С-54961 – Ларек,** площадью 12,1 кв. м, назначение: здание специализированное розничной торговли, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 7401000005003093 (право постоянного пользования, площадь 0,411 га, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания склада материалов) по адресу: г. Могилев, ул. Полевая, 6.

**Вагончик МК-7**, инв. № 2; **торговый павильон** (3,5*6,0), инв. № 126; **узел учета тепла**, инв. № В18; **забор из металлопрофиля,** инв. № В09; **металлоконструкция склада (19,0х5,7),** инв. № В05; **мощение цементно-бетонное,** инв. № 70057; **ограждение базы,** инв. № 18; **охранная сигнализация,** инв. № 102; **сигнализация,** инв. № 40; **стеллаж «Нико»**, инв. № В16; **стеллаж угловой,** инв. № 37; **стеллаж ШП-1930**, инв. № 21; **стеллаж ШП-1930**, инв. № 30; **стеллаж ШП-1930**, инв. № 31; **стол для компьютера**, инв. № 50; **стол для компьютера**, инв. № 51; **стол для компьютера**, инв. № 52; **стол для компьютера**, инв. № 53; **стол для компьютера**, инв. № 67; **шкаф 2-створчатый**, инв. № 17; **шкаф для одежды 2-ств**., инв. № 34; **шкаф для одежды 2-ств**., инв. № 36; **шкаф для одежды МД-184**, инв.№ 19; **шкаф для одежды МД-184**, инв. № 55; **шкаф прихожая П-59**, инв. № 20; **кондиционер «Сплит» с кронштейном КСКП 450*450,** инв. № 224; **котел FERROLI**, инв.№ 127.

Начальная цена продажи: 386 904,42 бел. рубля с учетом НДС (20 %). Сумма задатка: 38 690,44 бел. рубля.

**Аукцион состоится 2 сентября 2019 года в 15.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к.352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесение задатка: по 30.08.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Продавец**: ОАО «Быховский консервно-овощесушильный завод», УНП 700183696, Могилевская обл, г. Быхов, ул. Красноармейская, 26

**Организатор аукциона**: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

**Расчетный счет для внесения задатка:** Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Продавец и Победитель аукциона обязаны в течение 15 (пятнадцать) календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли – продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи

Информация о предыдущем аукционе была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 12.03.2019, 03.05.2019 и 25.06.19

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**

## Извещение о проведении 91-го открытого аукциона по продаже земельных участков в Солигорском районе 11 сентября 2019 г.

| № лота | 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|---|
| Предмет аукциона | право заключения договора аренды земельного участка | | | |
| Адрес земельного участка | **Минская обл., Солигорский р-н, Чижевичский с/с, п. Хвалево, ул. Центральная, 10А** | **Минская обл., Солигорский р-н, Чижевичский с/с, п. Хвалево, ул. Центральная, 6Б** | **Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск по ул. Строителей** | **Минская обл., Солигорский р-н, Старобинский с/с, д. Поварчицы по ул. Советская** |
| Кадастровый номер | 625085411601000116 | 625085411601000117 | 625050100001003063 | 625086202101000352 |
| Площадь, га | 0,1354 | 0,1353 | 0,2609 | 0,0742 |
| Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества (целевое назначение) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома) | | размещение объектов многоквартирной жилой застройки (строительство и обслуживание многоквартирного жилого дома повышенной комфортности) | размещение объектов розничной торговли (строительство и обслуживание магазина) |
| Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории* | имеется подъезд с песчано-гравийным покрытием, возможность подключения к сетям электроснабжения, газоснабжения, связи | | имеется транспортная и инженерная инфраструктура | имеются асфальтированные подъездные пути, возможность подключения к сетям электроснабжения, газоснабжения и связи |
| Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений | земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, – 0,0046 га | земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, – 0,0048 га | земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения, – 0,0272 га, линий связи и радиофикации – 0,0197 га, электрических сетей – 0,0015 га, объектов газораспределительной системы – 0,0423 га | земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, – 0,0036 га |
| Начальная цена продажи, руб. | 1 084,18 | 1 083,38 | 43 978,66 | 212,54 |
| Сумма задатка, руб. | 216,00 | 216,00 | 8 795,00 | 42,00 |
| Срок аренды земельного участка / условия продажи | 30 лет / см. пункт 6 | | 10 лет / 1. После ввода объекта в эксплуатацию безвозмездно передать в собственность Солигорского района жилые помещения в количестве 10 процентов общей площади (на основании подпункта 1.5. пункта 1 решения Минского облисполкома от 14 ноября 2014 г. № 978); 2. см. пункт 6 | 20 лет / см. пункт 6 |
| Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. | 2 411,03 | 2 463,29 | 3 072,84 | 3 345,40 |
| | + затраты на объявление в СМИ | | | |

**в разделе указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте*

Продавец: Солигорский районный исполнительный комитет (далее – райисполком), 223710, г. Солигорск, ул. Козлова, 35.

Порядок проведения аукциона и порядок оформления участия в торгах определяются Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

**1. Аукцион состоится в 15.00 11 сентября 2019 г. по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, зал заседаний райисполкома.**

2. Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

2.1. заявление на участие в аукционе по установленной форме; при подаче заявления представитель юридического лица должен иметь паспорт, доверенность на участие в аукционе и на подписание документов, физическое лицо (или его представитель, участвующий в аукционе по нотариально удостоверенной доверенности) – паспорт;

2.2. копии устава, учредительных документов, свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов (для юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования (для индивидуальных предпринимателей), копию паспорта, выписку об открытии в филиале 633 АСБ «Беларусбанк» лицевого счета для возврата задатка (для физических лиц);

2.3. документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на расчетный счет райисполкома (УНН 601061003) № BY75 AKBB 3641 0000 0429 7660 0000 в филиал 633 АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY21633, с отметкой банка, не позднее срока окончания приема документов на участие в аукционе – 5 сентября 2019 г.;

2.4. гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо заключает с райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по установленной форме.

3. По лотам №№ 1 – 4 осуществляется ежегодная уплата арендной платы согласно кадастровой стоимости земельного участка и его целевому назначению.

4. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с земельными участками и документацией. Осмотр земельных участков осуществляется претендентами на участие в аукционе самостоятельно либо в сопровождении специалиста управления землеустройства райисполкома в согласованное время (рабочие дни) в течение установленного срока приема документов.

5. Аукцион по каждому лоту состоится при наличии не менее двух участников. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов максимальную цену.

6. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

подписать протокол аукциона в день проведения аукциона;

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона (в счет оплаты засчитывается сумма внесенного задатка), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения;

не позднее 2 рабочих дней после совершения оплаты заключить с районным (сельским) исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок, после его заключения, государственную регистрацию права на земельный участок;

в течение одного месяца со дня осуществления государственной регистрации права на земельный участок обратиться в райисполком для получения разрешительной документации на проектирование и строительство объекта;

обеспечить соблюдение требований градостроительного паспорта земельного участка при осуществлении проектирования и строительства;

в течение двух месяцев после получения разрешительной документации на проектирование и строительство объекта заключить договор подряда на выполнение проектных работ;

обеспечить разработку проектно-сметной документации в сроки, установленные Положением о порядке определения продолжительности разработки проектной документации на строительство зданий и сооружений, утвержденным приказом Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь от 16 февраля 2005 г. № 40;

согласовать и утвердить в установленном порядке разработанную проектно-сметную документацию в течение трех месяцев;

юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю не позднее 6 месяцев, а гражданину не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к освоению земельного участка;

осуществить строительство жилого дома – в сроки, установленные законодательством, иного объекта – в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

возместить в установленном порядке затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к предоставленному земельному участку в соответствии с частью третьей подпункта 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

**7. Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: г.Солигорск, ул.Козлова, 35, кабинет 244, с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по рабочим дням со дня опубликования настоящего извещения и по 5 сентября 2019 г. включительно. Контактные телефоны: 8 (0174) 22 77 46, 22 55 23.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Республиканского дочернего унитарного предприятия «Белоруснефть-Транс» (продавец) извещает о проведении 23 августа 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Местонахождение имущества:** (лот № 1) г. Барановичи, ул. Тельмана, 102/11; (лот № 2) г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, 13/1; (лот №№ 3, 4) г. Мозырь – 11 промзона Михалки; (лот № 5) Брестская обл., г. Кобрин, ул. Пролетарская, 187. **Примечание:** имущество реализуется без учета НДС 20 % (в соответствии с п. п. 2.3 ст. 93 НК РБ, при условии выполнения п. 6.11. Указа РБ № 294 от 04.07.2012 г.) | | |
| 1 | **Грузовой специальный бункер MAZ 533702 240** (рег. знак № АМ 3033-3), инвентарный номер № 2701 (по бух. учету), год выпуска – 2006 | **17 736,56** | 1 773,66 |
| 2 | **Грузовой специальный бункер MAZ 533702 240** (рег. знак № АМ 3047-3), инвентарный номер № (по бух. учету), год выпуска – 2006 | **17 709,56** | 1 770,96 |
| 3 | **Грузовой специальный MAZ 533702 240** (рег. знак № АМ 3076-3), инвентарный номер № 2360р (по бух. учету), год выпуска – 2004 | **25 712,77** | 2 571,28 |
| 4 | **Седельный тягач MAZ-MAN 640268** (рег. знак № АК 7800-3), инвентарный номер № 6934 (по бух. учету), год выпуска – 2008 | **2 000,30** | 200,03 |
| 5 | **Грузовой специальный автомобиль MAZ 533702 241** (рег. знак № АМ 3194-3), инвентарный номер №1891К (по бух. учету), год выпуска – 2005 | **27 023,25** | 2 702,33 |

**Продавец: государственное предприятие «Белоруснефть-Транс»,** ул. Книжная, 15Б, 246003, г. Гомель, Республика Беларусь. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 249-56-43, инженер транспортного цеха – Терещенко Павел Александрович. **Шаг аукциона – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (Республиканское дочернее унитарное предприятие «Белоруснефть-Транс»):** УНП 491317683, IBAN BY34 BPSB 3012 1728 2601 1933 0000, BIC (SWIFT) банка BPSBBY2X в ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, назначение платежа – **задаток за участие в аукционе за лот №** (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 8 августа 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 21 августа 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения.

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником**, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)». **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 25.05.2019 г. № 96 (28963). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232)23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

**Аўтарка найчасцей выступае з сацыяльнымі тэмамі, якія добра ўмее падаць праз мастацкі твор. Гісторыя Светлячка не можа не закрануць душу.**



Настасся НАРЭЙКА

# СВЕТЛЯЧОК

Сёння начное дзяжурства належыць мне. Будзе жоўты, як старая папера, круг ад настольнай лямпы, будзе вечная кніга з дробным шрыфтам, апошнюю старонку якой перагарну тады, калі абрынецца на свет другі патоп, будзе пранізліва-гучнае ціканне гадзінніка — пульс часу. Будзе ноч...

А пакуль што хуткім крокам іду па горадзе. Парк сцеле пад ногі мокрае кляновае лісце колеру золата. Шары ліхтароў, вымытыя да бляску, коцяцца ўздоўж алеі, не адстаючы ні на крок. І я бягу — не магу ўтрымацца. На скрыжаванні жоўтае святло дае перавесці дыханне, але гэта некалькі секунд. Плынь падхоплівае мяне і нясе далей. Мільгаюць вітрыны, газетныя шапікі з ручайкамі цікаўных да таго, што робіцца ў свеце, лавачкі і аранжавыя камізэлькі адказных за чысціню горада... Звычайна плынь пакідала мяне якраз ля неабходных дзвярэй, але гэтым вечарам я сама выпала з яе. Выпала, бо ўбачыла жанчыну з пустымі вачыма (у ТАКІХ вочы заўсёды пустыя).

Яна сядзела на прыступках ля дзвярэй жаночай кансультацыі, белая, як крэйда. Глядзела цераз рэчы і людзей, не плакала і, здавалася, не дыхала. Яна прамерзла да касцей, запэцкала брудам паліто колеру кавы з малаком. Я пайшла далей, бо ведала, што, калі загавару з незнаёмкай, пачну яе шкадаваць. Гэта нельга...

Я спынілася перад старым двухпавярховым домам з забітымі крыж-накрыж вокнамі і гучна ўцягнула паветра, горкае, што палын. «Толькі азірніся!» — прыгразіла сабе і рванула з усяе сілы перакошаныя дзверы з аблупленай фарбай.

Гэты стары будынак быў месцам маёй працы. Ніхто ў горадзе нават не здагадваўся, што ў ім жывуць дзеці. Тыя дзеці, што маглі б хадзіць па зямлі, гаварыць прыгожай мовай, спяваць цудоўныя песні, смяяцца, плакаць, радавацца і сумаваць. Яны маглі б жыць, калі б у будынку побач, у той самай жаночай кансультацыі, іх не пазбавілі такой магчымасці.

Я зачыніла за сабою дзверы і прыціснулася да іх ілбом. Я баялася павярнуцца і ўбачыць немінучае. Я ведала, што за спінай маёй, за сталом, які на сённяшнюю ноч стане маім прыстанкам, сядзіць дзіця — хлопчык ці дзяўчынка (хутчэй за ўсё, дзяўчынка), — чыя маці (хоць якая яна маці?) брыдзе зараз па вуліцах начнога горада ў паліто колеру кавы з малаком і ведае, што ўсё для яе скончана.

— Скажыце...

Я здрыганулася, пачуўшы тоненькі, бы званочак, голас.

— Вы — мая мама?

Я павярнулася павольна-павольна ў спадзяванні, што мне проста падалося. Але за сталом у белым (яны заўсёды ходзяць у белым, нашы дзеці) сядзела дзяўчынка з залатымі, як лісты ў парку, валасамі. Яна глядзела на мяне, і вочы яе былі не пустыя. Нечалавечыя вочы, бо і сама яна была не чалавекам, а анёлам (мы не разумеем, чаму ў нашых дзяцей не растуць крылы...).

Дзяўчынка паўтарыла сваё пытанне яшчэ раз. Я падышла, узяла яе на рукі, села. Яна зручна ўладкавалася на маіх каленях, абняла рукамі за шыю, змахнуўшы з каўняра паліто кропелькі дажджу. Я ведала, што цяпер, у першае ж імгненне, павінна расказаць ёй праўду. Некалі даўно мы з калегамі спрачаліся, ці варта гаварыць нашым дзецям пра тое, хто яны. Спярша я была супраць, але потым зразумела: для таго каб выконваць работу, ім патрэбна ведаць.

— Як цябе завуць? — спытала я, каб хоць на некалькі імгненняў адцягнуць момант праўды.

— Светлячок, — сказала дзяўчынка.

— Я не твая мама, Светлячок.

Тысячу разоў бачыла, як гаснуць дзіцячыя вочы пасля гэтых слоў.

— Тады хто?

— Ведаеш, твая мама аднойчы моцна закахалася і аслепла ад сваіх пачуццяў. Яна не заўважала нічога навокал, жыла толькі імі. Пра жонку і дзяцей свайго каханага яна даведалася толькі тады, калі расказала яму пра цябе, пра тое, што ты будзеш.

— А тата?

— Людзі часта робяць памылкі, Светлячок. Таму ён папрасіў тваю маму ніколі больш яго не турбаваць і знік. А яна была слабая і ганарлівая адначасова, баялася скосых позіркаў і таго, што скажуць пра яе ў маленькім горадзе.

— Мама вырашыла, што я ёй не патрэбная?

— Так, — нельга было хлусіць нашым дзецям. — Яна пайшла туды, дзе людзі ў белых халатах дапамагаюць пазбавіцца... развітацца... вызваліцца...

Я не магла падабраць слова.

— Я зразумела, — апусціла галаву дзяўчынка, а потым зноў паглядзела мне проста ў вочы. — Гэта справядліва?

— Несправядліва, — не задумваючыся, сказала я. — Ты, напэўна, стамілася, Светлячок? Пойдзем, я пакажу табе твой ложак.

Мы ціха падымаліся па лесвіцы, каб не патрывожыць сваімі крокамі іншых дзяцей.

Я правяла яе паміж двума радамі ложкаў і паказала вольнае месца. Яна наблізілася, правяла маленькай рукой па мяккай тканіне белай начной сарочкі, раскладзенай паверх коўдры.

— Табе дапамагчы?

Яна кіўнула і павярнулася спінай, каб я магла расшпіліць гузікі. Я вызваліла адзін, другі, трэці... І толькі на чацвёртым плечы Светлячка дробна задрыжалі. Імгненна павярнуўшы дзяўчынку да сябе, я моцна абняла яе, нібы хацела выцісну ць увесь боль з гэтага маленькага чалавека.

— Скажыце, ва ўсіх гэтых дзяцей таксама не будзе жыцця?

— Жыццё будзе. Толькі іншае. Ты ўсё зразумееш потым.

— Чаму мамы кінулі іх? Таму што былі такія слабыя, як мая?

— Сітуацыі розныя, Светлячок. Вось бачыш, злева ад цябе спіць дзяўчынка. Яе завуць Сонейка. Светлае імя, праўда? Мама гэтай дзяўчынкі зацяжарала і нечакана засталася без мужа. Ён загінуў, у яе на руках ужо былі пяцёра сыноў, над галавой — дах здымнай кватэры... Выбару, здавалася, не існавала. Мама Сонейка зрабіла тое самае, што і твая.

— А гэты хлопчык на ложку справа? — спытала дзяўчынка.

— Ліхтарык. Яго мама яшчэ дзяўчынкай звязалася з дрэннай кампаніяй і аднойчы раніцай пасля вясёлай ночы з водарам гарэлкі прачнулася побач з незнаёмцам. Гэта быў канец. У школе, дома — паўсюль хутка стала вядома. Асабліва злаваўся строгі бацька, паабяцаўшы ніколі не дараваць. Простае выйсце падказала старэйшая сястра, за руку адвяла куды трэба. Ліхтарык так і не нарадзіўся, а дзяўчынка, яго маці, потым памерла. Ёй было 15...

Светлячок маўчала, толькі рэдкія ўсхліпы ўваходзілі ў маё плячо, як нажы.

— Скажыце, я... Мы калі-небудзь убачым сваіх мам?

— Убачыце, — сказала я. — Ты пра ўсё даведаешся заўтра.

Я пасадзіла яе на ложак, дапамагла зняць сукенку і апрануць сарочку, потым накрыла коўдрай і пацалавала ў лоб.

— Дабранач.

Я беглa па калідоры. Лесвіца... Нарэшце! Цяпер можна плакаць уголас. Я села за свой стол. Той самы. І старонка разгорнутай кнігі хутка размокла ад слёз, як караблік з газетнай паперы, што пацярпеў крушэнне ў вірлівым ручаі.

Ведаеце, часам я праклінала сваю работу, часам мне здавалася, што я змагу без яе жыць. Дарма.

Усю ноч я сядзела без руху, а потым незаўважна заснула цяжкім, як вечнасць, сном. Сонца з'явілася раптоўна... Яно прайшло праз забітыя дошкамі вокны і заліло пакой цёплым грэцкім мёдам. Наш дом ажываў. Дом маленькіх анёлаў...

Тупаценне босых ножак прымусіла мяне схамянуцца. Я паднялася з крэсла і замерла ў чаканні: вось зараз па лесвіцы скоцяцца мне насустрач нашы дзяўчынкі і хлопчыкі з незвычайнымі імёнамі... Аднак тупаценне раптам сціхла. Я спярша спужалася, а потым успомніла пра Светлячка. Відаць, дзеці заўважылі, што ў іх пакоі з'явілася новенькая, і зараз распытваюць яе.

Я паглядзелася ў люстэрка на сцяне. Валасы былі зблытаныя, а вочы — сухія і горкія. Я пайшла наверх. Дзеці сапраўды абступілі Светлячка.

— Добрай раніцы, — усміхнулася я.

З радаснымі воклічамі яны кінуліся да мяне, ледзь не збіўшы з ног.

— Вось гарэзы, зусім вы распусціліся! — пачуўся ад дзвярэй голас маёй калегі, той, што прыйшла на дзённую змену.

Калі дзеці кінуліся жадаць добрай раніцы маёй напарніцы, да мяне ціха падышла Светлячок.

— Вы абяцалі мне расказаць...

Я ўзяла яе за руку і павяла ў свой пакой. Сюды, на Канапу Сакрэтаў, прыводзіла кожнага. І кожнаму расказвала адно і тое ж.

— У цябе цяпер будзе праца, Светлячок.

— Праца? — яна перапытала без усялякай цікавасці.

— Так. Ведаеш, на свеце вельмі шмат жанчын, якія зараз знаходзяцца ў стане вагання, думаюць, робяць выбар, як некалі твая мама. Дык вось, нашы дзеці, і ты ў тым ліку, прыходзяць да гэтых жанчын у снах і расказваюць, угаворваюць, спрабуюць засцерагчы ад памылкі, зберагаючы тым самым іншых хлопчыкаў і дзяўчынак.

— Гэта дапамагае?

— Дапамагае. Не заўсёды, зразумела, але ўсё ж.

Яе тварык засвяціўся ўсмешкай:

— Калі я магу пачаць?

**Новая рубрыка часопіса «Маладосць» пад назвай «Адкоткі» — спроба альтэрнатывы ютубаўскім коцікам. Тут таксама яны, але жывёлы не смешаць, а нечаму вучаць.**



Юльяна ПЯТРЭНКА

# ВУЧУСЯ НЕ БЫЦЬ МАМАЙ

Марго пабывала ў руках ветэрынара — цяпер ёй ніколі не зведаць радасці і смутку мацярынства. Таму яна раўнадушна назірае праз аконную шыбу за тым, як суседская чорная котка перацягвае цераз плот свой непаслухмяны вывадак.

Кацяняты пішчаць і працівяцца, брыкаюцца і валтузяцца між сабой. Толькі мама перацягне за карак першага і возьмецца за другога, як першы зноў падлезе ў шчыліну пад плотам, апынецца ў нашым гародзе і пачне кусаць яе хвост ды цягаць за вушы братоў і сястрычак. Усе чацвёра аднолькава пушыстыя і рудыя — і мы з Марго дакладна ведаем, хто іх тата.

Вялізнаму персу з кірпатай мордачкай і закручанымі вусамі не пашанцавала: ці то згубіўся, ці то выкінулі. З шыкоўнага і велічнага караля ён паступова ператварыўся ў пірата і разбойніка: адно вока, разадраныя вушы, перабітая лапа і выцвілая, з каўтунамі поўсць. Але і ў такім выглядзе былы кароль застаецца манархам: з абурэннем патрабуе на чужых ганках падаткі — рыбу і сасіскі, з пагардай дражніць з платоў ніжэйшую расу сабак, не дае праходу цераз свае ўладанні ніводнаму каты-чужынцу і лёгка даганяе любую котку-фрэйліну, на якую толькі ўпадзе позірк.

Нават мая храбрая каралева і тая асцерагаецца перса. Марго абыходзіць аднавокага за дваццаць крокаў, пакуль той адпачывае ў цяньку пад кустом парэчак, варушыць рудым хвастом і назірае за парадкам. Да шматлікіх сваіх нашчадкаў вялікай справы яму няма. Ляжыць паважна, як леў.

Мой муж таксама Леў. Па гараскопе. І таксама любіць паважна паляжаць. Пад парэчкамі — менш, на канапе з пультам ці кніжкай — больш. З сынам асабліва не няньчыцца. Лічыць: усё, што мог, яму даў, у галаву ўклаў. Параду ці дапамогу сын атрымае, калі спатрэбіцца. Астатняму навучыцца сам, праз асабістыя шышкі, сінякі і граблі. Як усе. Інакш немагчыма.

А я? Я — львіца, ваўчыца і мядзведзіца! Рухаюся без шуму, бачу ў цемры, чую здалёк і не сплю начамі! Я — МАМА! Нават калі сабраць з ваколіц усіх клапатлівых котак і курыц-квахтух ды скласці іх на вагі, то і яны не пераважаць: саваё дзіцятка я перанясу цераз любы плот і ўсялякую лужыну. Расчашу, прыбяру і распраўлю хвосцік. Зашпілю гузікі і завяжу шнуркі. Прынясу ежу, падаткну коўдру і праўуркачу калыханку. Знайду найлепшых сяброў і настаўнікаў. Расчышчу дарогу, змяту перашкоды і парву ворагаў.

Але чаму, чаму сын не цэніць гэта? Чаму больш цягнецца да таты і бавіць з ім час? Няўжо сам хоча цераз плот лезці? Хоча ўпасці і выпацкаць лапы? Што скажаш, Марго? Ад каго ж маё дзіцятка ўзяло розум і здаровы сэнс?

Котка пазяхнула і скруцілася на падваконні: «Ад цябе. Бацькаў у бацькі застаўся...»

SEX-БАЛЯСЫ

# БЕЗ ТВАРУ

**Усе памятаюць аднайменны баявік з элементамі навуковай фантастыкі і Джонам Траволтам і Нікаласам Кейджам у галоўных ролях, які выйшаў на кінаэкраны ў 1997 годзе? Нагадаю коратка, што па сюжэце фільма спецыяльны агент ФБР і вядомы міжнародны тэрарыст памяняліся тварамі. А потым кожны ў новым абліччы, але з ранейшай сутнасцю працягвае свае справы. Карацей, не заблытайся — дзе хто. («— Ну, як у вас з дзецьмі? — Стаміліся вельмі, не высыпаемся, часу на сябе ўвогуле няма. — А Лена як? — Лена — гэта я. Пеця выглядае яшчэ горш».) І галоўная задача станоўчага героя — вярнуць сабе твар і, адпаведна, добрае імя. Гэта я да чаго хілю? Навуковая фантастыка стала рэальнасцю. Я пра нядаўнюю вірусную папулярнасць дадатку FaceApp, які праз фота дазваляе змяняць пол, узрост, карэктаваць прыгажосць. Хто паспеў «састарыцца» сам і паглядзець на знакамітасцяў у гадах? Усе прыгажунчыкамі атрымаліся ці толькі зоркі? («Я не стары, у мяне проста твар вінтажны».)**

Усё б нічога, гэтае штучнае старэнне можна было б разглядаць як чарговую забаўку, каб не адно але... Амаль адразу са з'яўленнем дадатку пачалі гаварыць пра рызыкі, звязаныя з ім. Падобныя праграмы збіраюць велізарныя аб'ёмы персанальных звестак і ніхто не ведае, як яны будуць выкарыстаны ў будучыні. Варыянтаў мноства: ад рэкламы да маніпулявання грамадскім меркаваннем на выбарах, кажуць спецыялісты. («У пошукавых запытах у інтэрнэце перад уводам тэксту трэба папярэджваць людзей: «Усё, што вы напішаце, будзе выкарыстана супраць вас у рэкламе».) Вось тут сапраўды — як бы ў будучыні не «страціць твар»...



Або знайсці яго там, дзе быць не павінна. Гэта я ўжо пра іншае. Дзякуючы тэхналогіі DeepFake можна лёгка і без асаблівых тэхнічных навыкаў «прыстаўляць» галовы зорак ці звычайных дзяўчат да цел порнаактрыс. Відэаролікі адрэдагаваныя настолькі добра, што іх не адрозніць ад сапраўднага кіно «для дарослых». («Кожны раз, калі гляджу са сваёй дзяўчынай парнафільм, мы пачынаем займацца каханнем, і я прапускаю ўсё самае цікавае».) Небяспека ў тым, што тэхналогія можа быць выкарыстана для шантажу ці прыніжэння жанчын.

А дадатак DeepNude «распранае» дзяўчат праз нейрасеткі. На хлопцах дае збой, паколькі не для таго распрацоўваўся. («— Мой муж лічыць, што ў яго фігура, як у грэчаскага бога. — Ты патлумач яму, што Буда зусім не з Грэцыі».) Журналісты празвалі яго эвалюцыяй вышэйназванага дадатку DeepFake. Новы алгарытм яшчэ прасцейшы ў засваенні — фэйкавы здымак можна зрабіць за пару клікаў. Карыстальнік загружае фота чалавека ў адзенні, а на выхадзе атрымлівае выяву з аголеным целам. Гэты дадатак быў узламаны, і здымкі трапілі ў адкрыты доступ. Балазе, неўзабаве аўтары сэрвісу закрылі праект, бо карыстальнікі пачалі злоўжываць ім. («ПотЕрял лицо!» Памятаеце гэты эпізод з выступлення чэмпіёнаў Найвышэйшай лігі КВЗ каманды зборнай БДУ?)

А некаторыя агаляюцца добраахвотна. Напрыклад, спявачка Наташа Каралёва. Усё пачалося з таго, што яе калянжанка па цэху Святлана Лабада выклала ў сеціве здымак, на якім цалкам голая бландзінка стаіць на галаве ў адной з папулярных у ёзе асан. Насамрэч гэта была вядомая амерыканская блогерша Nude Yoga Girl. Дзяўчына публікуе здымкі, на якіх пазіруе ў розных асанах, але пры гэтым заўсёды хавае свой твар. Карыстальнікі вырашылі, што на фатаграфіі Лабада, пакуль блогерша не абвінавáціла тую ў прысвойванні чужой славы. Каралёва вырашыла памірыць апанентак і, прыгадаўшы цыркавое мінулае, прыблізна паўтарыла позу амерыканкі. Здымак падпісала кшталту «ў свае «ягадныя» 46 гадоў мне не сорамна дэманстраваць сваё аголенае цела». Ведаеце, і не паспрачаешся — сапраўды ўсё на месцы...

Гэтак жа, як у Джэніфер Лопес, якая нядаўна адзначыла сваё 50-годдзе. З гэтай нагоды ўсе зноў загаварылі аб прыгажосці галівудскай спявачкі і актрысы: згадалі і пра чароўную ўсмешку на твары, і пра шыкоўную фігуру ў такім узросце. Дарэчы, другім не менш вядомым «тварам» у Лопес з'яўляецца якраз «пятая кропка». («Сустракаюцца Брытні Спірс і Джэніфер Лопес. — Прывітанне, Брытні! Прывітанне, э-э-э... А ну, павярніся. А-а! Прывітанне, Джэніфер!») Сама юбілярка кажа, што гэтыя выгібы ў яе ад прыроды. «У маёй сям'і гаварылі: «У цябе вялікая попа, і гэта выдатна!» («Добрыя зубы — выдатны «кардаш'ян».)

